

ЦЭНЫ — НА КАНТРОЛІ СЕНАТАРАЎ

МС

АЛІМПІЙСКАЕ І ДЭПУТАЦКАЕ АЛЯКСАНДРА МАСЯЙКОВА

13



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

26 КАСТРЫЧНІКА 2022 г.
СЕРАДА
№ 210 (29832)

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Юрый АМБРАЗЕВІЧ, намеснік міністра замежных спраў:**

*«Мы глыбока перакананыя, што поспехі ў забеспячэнні ўстойлівага развіцця — гэта найважнейшы фактар міру і бяспекі. Сёння можна шмат пачуць аб тым, што ААН страчвае лідзіруючыя пазіцыі ў сваёй галоўнай ролі — падтрыманні глабальнага міру. Такія выказванні з'яўляюцца адлюстраваннем аб'ектыўнага стану ўзроўню міжнародных адносін. На жаль, цяперашняя ААН стала заложніцай дэградацыі сістэмы міжнароднай бяспекі і міжнароднага права, аднак Рэспубліка Беларусь па-ранейшаму лічыць, што прынцыпы ўзаемадзеяння дзяржаў, выкладзеныя ў Статуце ААН, не маюць альтэрнатывы. Менавіта аанаўскія ідэалы ў духу Сан-Францыска ляжаць у аснове ініцыятывы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь аб глабальным дыялогу ў мэтах фарміравання новай і ўсеабдымнай сістэмы калектыўнай бяспекі».*

## КОРАТКА

- **Устаноўлена яшчэ адна знішчаная фашыстамі вёска ў Белавежскай пушчы. Знойдзены звесткі аб месцы знаходжання вёскі Барак, дзе жылі 11 чалавек.**
- Біржавыя таргі агароднінай і бакалеяй з 31 кастрычніка пачнуць праводзіць на паніжэнне цаны.
- **«Белавія» з 1 снежня пачне лятаць у Дубай два разы на тыдзень.**

ISSN 1990 — 763X

# Жаночая работа!



Фота БелТА.

Першую ў раёне жанчыну-трактарыстку Лідзію СУЛІМ ведаюць і паважаюць не толькі ў роднай вёсцы Камуна, але і ва ўсёй Любаншчыне — за спагадлівасць, працавітасць, цёплыя адносіны да людзей. За руль свайго першага трактара Лідзія села, будучы 18-гадовай дзяўчынай. Рабоце ў роднай гаспадарцы яна аддала больш за 40 гадоў, у працоўнай кніжцы ёсць некалькі запісаў — падліковец малака, трактарыст, намеснік дырэктара па ідэалагічнай рабоце. Нават сёння, на пенсіі, у яе дома ёсць уласны аўтапарк — два трактары МТЗ-52 і Т-16. Жанчына не сядзіць склаўшы рукі — працуе ў Музеі меліярацыі Любанскага прадпрыемства меліярацыйных сістэм. У ім сабрана ўся гісторыя асушэння Мар'інскіх балот.

Май на ўвазе!

## КІРОЎЦАМ І ПЕШАХОДАМ — ПАДРЫХТАВАЦЦА!

**Заўтра ўступае ў сілу новая рэдакцыя Правілаў дарожнага руху**

**Адпаведны Указ — «Аб удасканаленні арганізацыі дарожнага руху» — быў падпісаны кіраўніком дзяржавы яшчэ ў красавіку. Апошнія змяненні ў ПДР уносіліся ў 2019 годзе, але праўкі былі нязначныя. Дакумент патрабаваў глабальнай карэкціроўкі: з'явіліся новыя сродкі перамяшчэння, на больш сучасны ўзровень выйшла транспартная інфраструктура, неадназначнымі заставаліся і некаторыя моманты ў арганізацыі дарожнага руху.**

Перш за ўсё, як паведамілі ў Дзяржаўнай аўтамабільнай інспекцыі, новаўвядзенні прынятыя з мэтай павышэння культуры ўдзельнікаў дарожнага руху, стымулявання выкарыстання электратранспарту і зніжэння колькасці дарожна-транспартных здарэнняў. Прадугледжаныя ўказам меры дазволяць павысіць бяспеку на дарогах, а ўздел у дарожным руху стане больш зручным і камфортным для грамадзян. Якія канкрэтна змяненні чакаюць кіроўцаў і пешаходаў, высвятляла карэспандэнт «Звязды».

СТАР. 4

Падзея

## Космас: размова па сутнасці

Без апоры на касмічны патэнцыял вырашэнне пытанняў бяспекі Саюзнай дзяржавы немагчымае



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

**VIII Беларускі касмічны кангрэс адкрыўся ў Нацыянальнай акадэміі навук. Як падкрэсліў у сваім выступленні на кангрэсе старшыня Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Уладзімір ГУСАКОЎ, Беларусь мае вялікі навуковы, тэхнічны і кадравы патэнцыял у касмічнай сферы, а таксама багаты вопыт распрацовак па касмічнай тэматыцы. Таму сёння можна з упэўненасцю казаць аб стварэнні ў нашай краіне касмічнай галіны, у якой задзейнічана больш як 20 навуковых і вытворчых арганізацый, працуюць каля 4 тысяч кваліфікаваных спецыялістаў, сфарміравана інфраструктура, мэта якой — стратэгічныя даследаванні.**

СТАР. 3

З першых вуснаў

# «ТРЭБА СТВАРАЦЬ СІСТЭМУ БЯСПЕКІ НА АБ'ЕКТАХ, ЯКІЯ БУДУЦЬ АТАКАВАНЫ Ў ВЫПАДКУ КІБЕРВАЙНЫ»

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка правёў нараду, прысвечаную кібербяспецы. Ключавое пытанне — праект указа, які павінен вызначыць прававую аснову стварэння нацыянальнай сістэмы забеспячэння кібербяспекі. Адпаведнае даручэнне раней даў кіраўнік дзяржавы. Праект указа прадставіў кіраўнік аператыўна-аналітычнага цэнтра Андрэй Паўлючэнка. Таксама ў нарадзе ўзялі ўдзел прэм'ер-міністр Раман Галоўчанка, кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Ігар Сергеенка, дзяржаўны сакратар Савета Бяспекі Аляксандр Вальфовіч.**

«Ва ўсім свеце, магчыма, для нас нехарактэрна, але, тым не менш, факты маюць месца быць, назіраецца рост кібератак», — заўважыў Прэзідэнт. І атакуюць перш за ўсё стратэгічныя аб'екты, дзяржаўныя органы, прадпрыемствы, банкаўскую сістэму. «Гэта значыць іх мэтай з'яўляюцца асноўныя пункты жыццезабеспячэння любой дзяржавы, у тым ліку і нашай. Гэта адзін з элементаў гібрыднай вайны, вельмі небяспечны элемент. Мэта — нанесці максімальную шкоду эканоміцы і дэстабілізаваць у выніку грамадства», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. Пры гэтым ён заўважыў, што апошняе характэрна не толькі для Беларусі, але і для любой дзяржавы, на якую накіравана такая атака.

Таму ў свой час было даручана ўнесці прапанову па максімальным процідзеянні кібератакам на аб'екты Рэспублікі Беларусь. Аператыўна-аналітычнаму цэнтру была пастаўлена задача прыцягнуць неабходных спецыялістаў і падрыхтаваць адпаведныя прапановы. Гэтыя прапановы і разглядаліся на нарадзе ў Прэзідэнта.

Разам з тым Аляксандр Лукашэнка папярэдзіў наконт стварэння дадатковых цэнтраў і структур. «Спачатку вы мне павінны прапанаваць, як засцерагчы нашу дзяржаву з улікам таго, што ў нас ёсць. Лішніх грошай няма для таго, каб хадзіць адзін за адным і нешта назіраць. Давайце будзем зыходзіць з таго, што мэты мы вызначылі, ведаем, што такое кібервайна, што такое кібербяспека», — адзначыў ён. Кіраўнік дзяржавы заўважыў, што ўсё прапісана ў Канцэпцыі нацыянальнай бяспекі. «Далей мы павінны разумець і разумеем, на што будзе накіравана кібератака. Дык вось, гэтыя аб'екты на месцы трэба абараняць. Будзем зыходзіць з гэтага, а не ствараць новы ўрад, міністэрства ці, як у нас прынята, цэнтры бяспекі для таго, каб назіраць. Чаго назіраць? Трэба ствараць сістэму бяспекі на тых аб'ектах, якія будуць атакаваны ў выпадку кібервайны», — упэўнены Прэзідэнт.

Ён адзначыў, што адпаведныя структуры доўга над гэтым працавалі, і пацікавіўся вынікамі работы.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

**У тэму**

### «ГЭТА АДВЕЧНАЯ БАРАЦЬБА СНАРАДА І БРАНІ»

Пасля нарады з Прэзідэнтам **кіраўнік аператыўна-аналітычнага цэнтра Андрэй ПАЎЛЮЧЭНКА** сустрэўся з журналістамі. «Пытанні кібербяспекі ў сучасным свеце з'яўляюцца неад'емнай часткай нацыянальнай бяспекі. І яны знаходзяцца ў полі зроку Прэзідэнта, ён вельмі ўважліва да іх ставіцца. Прэзідэнтам была пастаўлена задача падрыхтаваць дакумент, які будзе адпавядаць усім сучасным выклікам і пагрозам. Таму што пытанням кібербяспекі і кібераабароны сёння аддаецца вялікая ўвага, гэта павеў часу. І сутнасць гэтага дакумента ў тым, каб рэалізаваць у Беларусі сістэмны падыход да пытанняў кібербяспекі», — расказаў ён. Андрэй Паўлючэнка адзначыў, што беларускія спецыялісты супрацоўнічаюць з калегамі на міжнародным узроўні. Тым не менш у пытаннях арганізацыі кібербяспекі кожны ідзе сваім шляхам, паколькі ў кожнай краіны ёсць свае праблемы, свае інфармацыйныя рэсурсы і сваё поле дзейнасці. Але ў цэлым падыход да абароны аб'ектаў адзіны.

«Сёння ідзе пастаяннае кіберуздзеянне на інфраструктуру Рэспублікі Беларусь. Насамрэч гэта адвечная барацьба снарада і брані. І ў кібербяспецы няма мяжы дасканаласці. Гэта пастаянны працэс», — падкрэсліў кіраўнік ААЦ.

Заканадаўчыя навацыі

**Аляксандр АМЕЛЬЯНЮК:**

# «УНС — ГЭТА ЎЛАСНЫ ГІСТАРЫЧНЫ ВОПЫТ»



**Законапраект «Аб Усебеларускім народным сходзе» па праве можна назваць народным дакументам. Праект закона вынесены на грамадскае абмеркаванне, а гэта значыць, што кожны чыць сваю пазіцыю па тым ці іншым палажэнні, унесці прапанову можа любы жадаючы. Аб асаблівасцях заканадаўчага акта, а таксама ролі Усебеларускага народнага сходу ў жыцці краіны мы пагаварылі з намеснікам старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па заканадаўстве Аляксандрам АМЕЛЬЯНЮКОМ.**

***— Аляксандр Паўлавіч, практыка грамадскага абмеркавання найважнейшых заканадаўчых ініцыятыў у Беларусі ўжо ёсць. Не так даўно шырокая грамадскасць брала ўдзел у абмеркаванні змяненняў і дапаўненняў у Асноўны Закон краіны — Канстытуцыю. У чым перавага такой формы работы над заканадаўчым актам?***

— Гэта дазваляе найбольш аператыўна атрымаць сувязь з людзьмі. Грамадзяне непасрэдна могуць выказаць свае думкі па тым ці іншым законапраекце. Гэта дастаткова хуткае данясенне да парламента прапаноў і заўваг, якія ёсць па законапраектах, без пэўных дадатковых інстанцый. Мы самі бачым, чуем, што кажуць людзі, адчуваем іх эмоцыі, пачуцці, якія праяўляюцца пры выкладанні імі тых ці іншых прапаноў. Гэта таксама важна.

***— Відавочна, што заканадаўцы не змогуць улічыць усе прапановы, якія паступяць ад насельніцтва...***

— Гэта немагчыма. Аб гэтым мы казалі і тады, калі абмяркоўвалі праект змяненняў у Канстытуцыю, пра гэта кажам і цяпер. Напэўна, для чалавека, які штосьці прапаноўвае, важна, каб яго меркаванне супала з меркаваннем большасці і гэтая прапанова атрымала сваё замацаванне ў законе. Тым не менш, мы ўсе розныя, у нас неаднолькавыя пункты гледжання на тыя ці іншыя моманты, у тым ліку ў сферы прававадносін. Таму мы добра разумеем, што кожная прапанова не можа знайсці адлюстраванне ў законе. Туды трапяць найбольш важныя з іх, якія супадаюць з тым, што патрэбна грамадству. Калі прапанову выказвае большасць, калі яна сапраўды слушная, у яе таксама ёсць усе шанцы быць заканадаўча замацаванай.

***— На ваш погляд, у чым будзе заключацца асноўная функцыя новага дзяржаўнага органа, які неўзабаве стане Усебеларускі народны сход?***

— Гэта кансалідацыя ўсіх грамадскіх меркаванняў, прагрэсіўных сіл у нашым грамадстве. Гэта і магчымасць знайсці агульнае рашэнне, якое адлюстроўвае меркаванне найбольшай колькасці людзей — тое, што сапраўды патрэбна нам у той ці іншы перыяд развіцця нашай краіны.

***— Вырашэнне якіх пытанняў можа быць ускладзена на УНС?***

— Межы, у якіх дзейнічае УНС, акрэслены Канстытуцыяй. У праекце Закона «Аб Усебеларускім народным сходзе» больш дэталёва рэгламентуецца парадак разгляду пытанняў, якія аднесены да кампетэнцыі УНС. Закон можа ўтрымліваць і іншыя палажэнні, якія не прадугледжаны ў Канстытуцыі. Аднак паколькі гэта важны, стратэгічны акт, кірунак развіцця краіны, то, вядома, кампетэнцыі УНС замацаваны ў Канстытуцыі.

***— Тэрмін паўнамоцтваў Усебеларускага народнага сходу — пяць гадоў. Ці ёсць канкрэтныя задачы, якія за дадзены перыяд павінны ажыццявіць дэлегаты?***

— Ні ў Канстытуцыі, ні ў самім законапраекце пэўных канкрэтных, дэталёвых момантаў няма. Мэта падрыхтоўкі праекта і ўвогуле закона — пашырэнне ўдзелу ўсіх грамадзян у кіраванні справамі грамадства і дзяржавы. Гэта агульная задача. Яна глабальная, носіць агульны характар. А ставіць пэўныя вузкія мэты перад такім законам, напэўна, немэтазгодна.

***— Можна меркаваць, што многія грамадзяне захочуць стаць дэлегатамі УНС. У дачыненні да той часткі дэлегатаў, якую будзе прадстаўляць грамадзянская супольнасць, каму даверыць такую адказную місію?***

— Праект закона прадугледжвае, што Усебеларускі народны сход будзе фарміравацца з трох частак. Першая — дэлегаты па пасадзе. Другая — прадстаўнікі мясцовых Саветаў дэпутатаў. Трэцяя частка — прадстаўнікі грамадзянскай супольнасці. Па кожнай з гэтых частак, як прадугледжана праектам, ёсць абмежаваная колькасць дэлегатаў. Што датычыцца прадстаўнікоў грамадзянскай супольнасці, то для таго, каб больш дакладна вызначыць і разумець, хто гэта будзе, павінен быць прыняты Закон «Аб асновах грамадзянскай супольнасці». Сёння гэта пакуль праект. Безумоўна, згаданыя два праекты — «Аб Усебеларускім народным сходзе» і «Аб асновах грамадзянскай супольнасці» — цесна ўзаемазвязаныя. Казаць аб тым, хто будзе дэлегатамі, дастаткова складана, пакуль няма таго закона. Аднак трэба меркаваць, што гэта будуць прадстаўнікі найбольш масавых аб'яднанняў — напрыклад, такіх, як прафесіянальныя саюзы.

***— Такога закона, як і дзяржаўнага органа, няма ні ў адной краіне свету. Ці складана быць першапраходцам?***

— Быць першапраходцамі заўсёды складана. Гэта ўласны гістарычны вопыт. Аднак тым не менш, Усебеларускі народны сход у нас ужо праходзіў не адзін раз. Цяпер мы замацавалі яго статус у Канстытуцыі і развіваем у гэтым законе. Як грамадская з'ява УНС — тое, з чым мы ўжо знаёмыя. Нядаўняе мінулае — шэсць Усебеларускіх народных сходаў, якія адбыліся, паказалі сваю жыццяздольнасць і неабходнасць для беларускага грамадства ў вырашэнні найбольш важных задач. Цяпер у нашай палітычнай сістэме дадзены інстытут будзе канстытуцыйна замацаваны.

**Вераніка КАНЮТА.**

# РАЗАМ З МОЛАДДЗЮ

## Эксперты абмеркавалі вызначальную ролю УНС

**У краіне стартавала серыя дыялогавых пляцовак «Сіла закона». Падчас мерапрыемстваў, арганізаваных БРСМ, моладзь абмеркавала важныя законапраекты аб Усебеларускім народным сходзе. Таксама падчас сустрэч разглядаецца Канцэпцыя нацыянальнай бяспекі дзяржавы. Першы сакратар ЦК БРСМ Аляксандр ЛУК'ЯНАЎ падкрэсліў, што ў фармаце адкрытага дыялогу важна атрымаць ад моладзі зваротную сувязь:**

— Маладыя людзі хочуць браць удзел у фарміраванні важных базавых дакументаў. А ў далейшым, магчыма, хтосьці з іх — стаць дэлегатам Усебеларускага народнага сходу. Вельмі важна, каб у вышэйшы орган народаўладдзя былі ўключаны простыя хлопцы і дзяўчаты, працаўнікі сельскагаспадарчай галіны, вучоныя, людзі, якія займаюцца спортам, культурай, навукай, ваенныя. І тут задача грамадскіх аб'яднанняў і Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі — максімальна далучыць моладзь да такога працэсу.

Адна з сустрэч адбылася ў Нацыянальным цэнтры прававой інфармацыі, удзел у ёй узяло больш за 200 прадстаўнікоў беларускага студэнцтва і працоўнай моладзі. Мерапрыемства, арганізаванае разам з Дзяржаўным сакратарыятам Савета Бяспекі Беларусі, прайшло ў змешаным фармаце: афлайн і з падключэннем рэгіёнаў. Разам **з дырэктарам Нацыянальнага цэнтра заканадаўства і прававых даследаванняў Уладзімірам ІПАТАВЫМ** удзельнікі абмеркавалі вызначальную ролю Усебеларускага народнага сходу ў грамадстве і паўнамоцтвы УНС.

— Усебеларускі народны сход вызначае стратэгічныя напрамкі развіцця нашай краіны і грамадства, — адзначыў Уладзімір Іпатаў. — Калі мы пішам законапраекты, мы не проста пішам словы на паперы. Законапраект павінен умясціць, калі так можна сказаць, душу ў заканадаўства. І трэба тое зрабіць такім чынам, каб было зразумела людзям. Таму назва «Усебеларускі» — гэта аб'яднальнае слова. Звяртаючыся да першага УНС, які адбыўся ў 1996 годзе, можна прааналізаваць, якую вялікую ролю ён адыграў у свой час для кансалідацыі грамадства.

Падчас дыялогавай пляцоўкі эксперты разам з моладдзю таксама абмеркавалі шэраг іншых актуальных пытанняў: праект Канцэпцыі нацыянальнай бяспекі Беларусі, нацыянальную самабытнасць, гістарычную праўду, сацыяльную адказнасць грамадзян, развіццё атамнай энергетыкі і ахову персанальных даных. Арганізатары адзначылі, што прапановы ад моладзі, якія паступілі ў ходзе дыскусій, будуць накіраваны зацікаўленым.

**Арына КАРПОВІЧ.**

**Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь смуткуюць у сувязі са смерцю былога дэпутата Вярхоўнага Савета БССР адзінаццатага склікання, старшыні Віцебскага абласнога выканаўчага камітэта КУЛАКОВА Уладзіміра Панцялеевіча і выказваюць глыбокія спачуванні яго родным і блізкім.**

# Космас: размова па сутнасці

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— На Акадэмію навук ускладзена правядзенне адзінай дзяржаўнай палітыкі, рэгуляванне дзейнасці ў галіне даследавання і выкарыстання касмічнай прасторы ў мірных мэтах. Для рэалізацыі гэтых і іншых задач у касмічнай сферы ў НАН Беларусі ў 2015 годзе было створана і паспяхова функцыянуе Агенцтва па касмічных даследаваннях. Касмічная сфера вызначана як адна з прыярытэтных сфер інавацыйнага развіцця Беларусі, — дадаў старшыня Прэзідыума НАН. — У ліку перспектыўных напрамкаў — рэалізацыя нацыянальнай касмічнай праграмы на 2021—2025 гады, развіццё сістэмы дыстанцыйнага зандзіравання Зямлі, прымяненне вынікаў касмічнай дзейнасці ў інтарэсах розных сфер, уключаючы дакладнае земляробства, лічбавізацыю, вывучэнне Антарктыкі. Сярод актуальных напрамкаў таксама — развіццё нацыянальнай сістэмы спадарожнікавай сувязі і вяшчання, навігацыйнай, геадэзічнай і картаграфічнай дзейнасці на аснове касмічных тэхналогій, сістэмы аэракасмічнай адукацыі, распрацоўка новых матэрыялаў, якія прымяняюцца пры стварэнні касмічных апаратаў для даследавання блізкага і далёкага космасу, удзел у міжнародных праектах па вывучэнні Месяца, Марса і іншых аб'ектаў далёкага космасу.

— Часам мы празмерна рамантызуем касмічную тэматыку або, наадварот, разглядаем яе выключна з прыкладнога пункту погляду, маўляў, а што космас нам дае? Дык вось сёння мы цудоўна разумеем, што без развіцця сумесных касмічных праграм, сістэм сувязі, хуткага доступу ў інтэрнэт вырашэнне пытанняў, якога чакаюць ад нас аграрыі, землеўпарадчыкі, немагчымае. Разумеем, што для павышэння абараназдольнасці двюх дзяржаў, вырашэння пытанняў бяспекі Саюзнай дзяржавы мы таксама не абыдземся без апоры на касмічны патэнцыял, — падзяліўся сваімі думкамі **дзяржаўны сакратар Саюзнай дзяржавы Дзмітрый МЕЗЕНЦАЎ**. — Сёння праграмы Саюзнай дзяржавы — у прыярытэце для кіраўнікоў Беларусі і Расіі. Ужо паспяхова рэалізавана сем саюзных праграм у касмічнай сферы. Цяпер бакі прыступілі да восьмай праграмы «Інтэграцыя-СД», рэалізацыя якой разлічана да студзеня 2024 года. Беларуская наземная касмічная інфраструктура паспяхова інтэгравана ў адзіную касмічную наземную інфраструктуру Дзяржкарпарацыі «Раскосмас». Гэта дазваляе вырашаць тыя задачы, якія ставяцца бакамі, і, вядома, дазваляе сінхранізаваць і выходзіць на адзіныя стандарты ў атрыманні і распаўсюджванні таго сігналу, той інфармацыі, якія і ёсць, па сутнасці, галоўная мэта развіцця касмічных праграм.

> Дзмітрый Мезенцаў нагадаў, што бакі аб'явілі аб гатоўнасці працаваць над стварэннем беларуска-расійскага касмічнага апарата па дыстанцыйным зандзіраванні зямлі. Па даручэнні кіраўнікоў Беларусі і Расіі ў адрас НАН Беларусі і Дзяржкарпарацыі «Раскосмас» выдзелены значныя сродкі на гэтыя мэты.

У адказ на пытанне, ці стрымліваюць заходнія санкцыі супрацоўніцтва Беларусі і Расіі ў сферы космасу, ён сказаў: «Тая інтэграцыя, якая ўжо сёння адзначаецца бакамі, і тыя межы, на якія мы хочам выйсці, будуць максімальна паспяховым адказам на санкцыі. Так, мы адчуваем на гэтым этапе пэўныя цяжкасці і хочам як мага хутчэй іх пераадолець. Але гэта яшчэ і стымул для паглыблення навукова-даследчых і канструктарскіх работ, аналізу нашага патэнцыялу для рэалізацыі адзіных касмічных праграм Саюзнай дзяржавы. Найлепшым адказам на беспрэцэдэнтны ціск Захаду з'яўляецца больш згуртаваная, паслядоўная, прафесійная праца, аналіз таго, што мы маем і можам зрабіць сумесна...»

Трэба заўважыць, што на сучасным этапе як у Беларусі, так і ў Расіі істотна ўзраслі патрабаванні карыстальнікаў да характарыстык касмічнай інфармацыі, асабліва па прасторавым вырашэнні і перыядычнасці прадстаўлення касмічных здымкаў, а таксама па ўзроўні іх тэматычнай апрацоўкі. Моцна ўзраслі патрабаванні да паляпшэння характарыстык здымкаў для забеспячэння абараназдольнасці і нацыянальнай бяспекі, маніторынгу ўзнікнення і пераадолення наступстваў надзвычайных сітуацый прыроднага і тэхнагеннага характару і ў іншых найважнейшых сферах.

Як адзначыў у сваім выступленні **старшыня Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях Сяргей ШЛЫЧКОЎ**, у Беларусі першыя распрацоўкі па касмічнай тэматыцы адносяцца да пачатку 60-х гадоў XX стагоддзя. Менавіта ў гэты перыяд былі створаны навуковыя і канструктарскія арганізацыі, спецыялізаваныя вытворчасці, пабудаваны новыя заводы і, што самае галоўнае, сфарміраваны навуковыя школы. Важна адзначыць, што абсалютная большасць арганізацый, што былі задзейнічаны ў рэалізацыі савецкіх касмічных праграм, з поспехам працуюць і ў цяперашні час. У Беларусі выпускаецца высокадакладнае оптыка-электроннае абсталяванне, сучасная мікрапрацэсарная тэхніка, інтэгральныя мікрасхемы, выпрабавальнае абсталяванне і многае іншае. Беларускія ВНУ рыхтуюць спецыялістаў для аэракасмічнай галіны. На сучасным этапе развіццё касмічнай галіны ажыццяўляецца ў шчыльным супрацоўніцтве з Расійскай Федэрацыяй.

Сяргей Шлычкоў падкрэсліў, што першыя прэміі Саюзнай дзяржавы ў галіне навукі і тэхнікі былі ўручаны двум сумесным аўтарскім калектывам з Беларусі і Расіі менавіта па касмічнай тэматыцы. На яго думку, наступным крокам можа стаць фарміраванне Стратэгіі развіцця касмічнай дзейнасці Саюзнай дзяржавы, якая будзе ўключаць буйныя вынікі і ацэначныя тэрміны з рэсурсамі для іх дасягнення, а таксама распрацоўку бізнес-мадэляў камерцыялізацыі вынікаў касмічнай дзейнасці. «Зразумела, што бюджэт Саюзнай дзяржавы не зможа пакрыць цалкам патрэбы ў фінансаванні рэалізацыі маштабных інавацыйных праектаў, асабліва ў такой капіталаёмістай галіне, як касмічная. У сувязі з гэтым у дапаўненне да дзеючых арганізацыйна-прававых механізмаў рэалізацыі сумесных праграм і праектаў неабходна распрацаваць механізм прыцягнення сродкаў не толькі з бюджэту Саюзнай дзяржавы, але таксама і з іншых крыніц», — прапанаваў старшыня ДКНТ.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Рышы Сунак афіцыйна заняў пасаду брытанскага прэм'ер-міністра



Новы лідар кіруючай Кансерватыўнай партыі Вялікабрытаніі 42-гадовы Рышы Сунак атрымаў мандат на фарміраванне ўрада ад караля Карла III. Пра гэта паведамілі ў Twitter-акаўнце Букінгемскага палаца. На Даўнінг-стрыт Рышы Сунак змяніў Ліз Трас, якая 20 кастрычніка аб'явіла аб адстаўцы пасля правалу сваёй эканамічнай палітыкі і на фоне росту незадаволенасці калег па кіруючай Кансерватыўнай партыі. Усяго на пасадзе кіраўніка брытанскага ўрада яна правяла 44 дні, устанавіўшы антырэкорд. Сунак заняў пасаду прэм'ер-міністра на падставе таго, што ў панядзелак ён быў аб'яўлены новым лідарам кансерватараў. Абодва яго сапернікі — экс-прэм'ер Барыс Джонсан і лідар Палаты абшчын брытанскага парламента Пені Мордант — аб'явілі, што не будуць змагацца за пасаду кіраўніка ўрада.

### МВФ прагназуе для Еўропы рэкордныя цэны на газ і электрычнасць

Еўропа налета можа сутыкнуцца з рэкорднымі цэнамі на прыродны газ і электрычнасць, паведаміла РІА «Навіны» са спасылкай на даклад Міжнароднага валютнага фонду. У дакуменце адзначаецца, што да сярэдзіны верасня бягучага года пастаўкі расійскага газу ў Еўропу знізіліся на 80 працэнтаў у гадавым выражэнні. Поўнасцю экспарт спынены ў Балгарыю, Данію, Фінляндыю, Германію, Літву, Нідэрланды і Польшчу. Эксперты дапускаюць экстрэмальны сцэнарый, калі анамальныя халады спалучаюцца з поўным спыненнем паставак газу з Расіі. У такім выпадку краіны Еўропы будуць вымушаныя адшукваць магчымасці, каб скараціць спажыванне паліва на 6 працэнтаў. Для найбольш уразлівых краін гэты сцэнарый пагражае стратай каля 3 працэнтаў ВУП. Увесну рэгіён будзе спрабаваць папоўніць запасы. Сітуацыя можа прывесці да таго, што налета рынак зноў вернецца да рэкордна высокіх цэн на прыродны газ і электрычнасць, якія былі ў 2022-м. Як чакаецца, кошт жыцця ў Еўропе з-за энерганосьбітаў, якія падаражэлі, у 2022 і 2023 гадах узрасце адпаведна на 7 і 9 працэнтаў.

### Метэаролагі папярэдзілі ўлады Балі аб катастрафічных паводках

Нацыянальнае метэаралагічнае агенцтва Інданезіі папярэдзіла ўлады Балі, дзе ў сярэдзіне лістапада пройдзе саміт G20, што на тэрыторыі вострава ў хуткім часе магчымыя катастрафічныя паводкі, паведаміла агенцтва ANTARA. Кіраўнік метэаралагічнага агенцтва Абдул Мухары заявіў, што востраў асабліва ўразлівы цяпер з-за «няўмольнага» скарачэння яго прыбярэжных буферных зон. «Неабходна ўсведамляць магчымасць катастрафічных прыродных бедстваў, бо апошнія два тыдні становішча на Балі заставалася несуцяшальным, — заўважыў эксперт. — Улады вострава павінны ведаць аб такой магчымасці, таму што Балі з'яўляецца месцам правядзення саміту G20». Раней губернатар Балі Ваян Костэр заяўляў, што шэраг стыхійных бедстваў, якія адбыліся на Балі за апошнія тыдні, не перашкодзіць правядзенню сустрэчы G20 у лістападзе 2022 года. Паводле яго слоў, стан вострава прызнаны бяспечным, нягледзячы на тое што некалькі раёнаў пацярпела ад раптоўных паводак.

Экалогія

# Новая чарнобыльская праграма

## Для сацыяльна-эканамічнага развіцця і рэабілітацыі зямель пацярпелых рэгіёнаў



**Задачу па стварэнні ў межах Саюзнай дзяржавы новай сацыяльна-арыентаванай праграмы па пераадоленні наступстваў чарнобыльскай катастрофы на наступную пяцігодку абмеркавалі ў Мінску на пасяджэнні камісіі Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі. Аказанне комплекснай медыцынскай дапамогі асобным катэгорыям грамадзян абедзвюх краін, якія падвергліся радыяцыйнаму ўздзеянню, сумесная дзейнасць у межах Саюзнай дзяржавы па пераадоленні негатыўных наступстваў катастрофы, а таксама распрацоўка сумесных тэхналогій геалагічнага вывучэння, рацыянальнага і экалагічна бяспечнага выкарыстання нетраў Беларусі і Расіі — тэмы, разгледжаныя парламентарыямі.**

### КЛІМАТЫЧНЫЯ КЛОПАТЫ

Працягваць рэабілітацыю пацярпелых ад аварыі зямель, а таксама развіццё рэгіёнаў, якія падвергліся радыяцыйнаму ўплыву, праводзіць далейшы радыяцыйны маніторынг наваколля — такія задачы павінны выконвацца ў межах саюзнай праграмы, лічыць **старшыня Пастаяннай камісіі па пытаннях экалогіі, прыродакарыстання і чарнобыльскай катастрофы Палаты прадстаўнікоў Мікалай ВАСІЛЬКОЎ:**

— Кліматычная тэма даволі актуальная, і змены клімату адбываюцца поўнамаштабна, тэмпература за кошт парніковых газаў павышаецца, і гэта неспрыяльна адбіваецца на эканоміцы, сельскай гаспадарцы і здароўі насельніцтва. Так што ў частцы канцэпцыі праграмы гідраметэаралагічнай бяспекі на 2023—2027 гады мы хочам бачыць канкрэтыку, наколькі будзе рэалізавана тэхнічная аснашчанасць службаў і ведамстваў, наколькі прадказальныя стыхійныя бедствы, што могуць узнікнуць на тэрыторыі Саюзнай дзяржавы.

Наступствы чарнобыльскай аварыі будуць яшчэ 150 гадоў даймаць жыхароў пацярпелых тэрыторый. Не распрацоўваць сёння нейкія навуковыя падыходы і практычную рэалізацыю, каб мінімізаваць гэтыя наступствы, немагчыма. Так што названая праграма архіважная для абедзвюх дзяржаў. Калі насельніцтва не будзе пражываць на тэрыторыях, якія пацярпелі ад аварыі на ЧАЭС, то там не будзе і эканомікі. Адпаведна, гэтыя тэрыторыі знікнуць з карт і Беларусі, і Расіі, падкрэсліў ён.

### ТРАНСГРАНІЧНЫ ПЕРАВОЗ

У рамках дзейнасці камісіі працягваецца работа над гарманізацыяй заканадаўстваў Саюзнай дзяржавы, збліжэннем экалагічнай павесткі і рашэннем экалагічных выклікаў і пытанняў, якія паўстаюць перад абедзвюма краінамі, дадаў **намеснік старшыні Камісіі Парламенцкага сходу па прыродных рэсурсах, экалогіі і ахове навакольнага асяроддзя, першы намеснік старшыні Камітэта Дзяржаўнай думы па турызме і развіцці турыстычнай інфраструктуры Мікалай ВАЛУЕЎ**, які на пасяджэнні ўзняў пытанне трансгранічнага перавозу другаснай сыравіны, з якой можна стварыць новы прадукт:

— Ёсць нявырашаныя пытанні, што датычацца нарматыўных дакументаў, якія не дазваляюць абедзвюм краінам даволі хутка рэагаваць пры перамяшчэнні другаснай сыравіны паміж дзяржавамі. Існуе розны пералік нарматыўных дакументаў, якія неабходна афармляць, і яны таксама маюць розныя назвы. Як вынік, пры афармленні такіх грузаў назіраюцца больш доўгае афармленне і больш працяглы мытны пераезд.

Расійскі парламентарый спадзяецца, што пытанне неабходнасці гарманізацыі дакументаў, якія датычацца трансгранічнага перавозу другасных матэрыяльных рэсурсаў, будзе ўключана ў планы камісіі на 2024—2026 гады.

### МЕДДАПАМОГА І РЭАБІЛІТАЦЫЯ

— Аказанне комплекснай высокатэхналагічнай і спецыялізаванай медыцынскай дапамогі асобным катэгорыям грамадзян — таксама актуальная праграма. Яна запатрабавана насельніцтвам, медыцынскія ўстановы працуюць паспяхова, маюць добрую матэрыяльна-тэхнічную базу. У перспектыве для арганізацыі аказання меддапамогі будзе выдзелена каля 260 мільёнаў рублёў, — падкрэсліў Мікалай Васількоў.

Парламентарыі бачаць перспектыву і ў кірунку развіцця праграмы па рэабілітацыі дзяцей, якія пацярпелі ад аварыі. Пакуль такая праграма прапрацоўваецца з профільнымі міністэрствамі абедзвюх краін.

**Ірына СІДАРОК.**

# КІРОЎЦАМ І ПЕШАХОДАМ — ПАДРЫХТАВАЦЦА!




## НА ЭЛЕКТРАСАМАКАЦЕ І СЕГВЭІ — НЕ БОЛЬШ ЯК 25 КМ/Г

Што датычыцца тэрміналогіі, канкрэтызаваны некаторыя назвы транспартных сродкаў. У прыватнасці, веласіпедам будзе называцца такі транспартны сродак, які мае не менш за два колы і прыводзіцца ў рух мускульнай сілай чалавека, што знаходзіцца на ім, у прыватнасці, пры дапамозе педаляў або ручак. Такім чынам, самакаты, аднакалавы транспарт не з'яўляюцца веласіпедамі. Аднак да веласіпедаў прыраўноўваюцца аналагічныя па канструкцыі транспартныя сродкі, якія маюць электрарухавік. Іх магутнасць не павінна перавышаць 0,25 кВт, а скорасць — не развівацца звыш 25 км/г.



Знак «Зона з абмежаваннем максімальнай скорасці руху».

Па веласіпеднай дарожцы цяпер павінны перамяшчацца не толькі веласіпедысты, а і пешаходы, якія кіруюць электрасамакатамі, гіраскутарамі, манаколамі, сегвэямі і падобнымі на іх — усё гэта будзе называцца сродкамі персанальнай мабільнасці. Вельмі важны момант: такія прылады і прыстасаванні не з'яўляюцца транспартнымі сродкамі. Дадзеная катэгорыя з'явілася ў Правілах дарожнага руху ўпершыню і, адпаведна, трапіла пад канкрэтныя патрабаванні. У прыватнасці, для сродкаў персанальнай мабільнасці ўстаноўлена максімальная скорасць — не больш як 25 км/г. Пры гэтым выкарыстоўваць іх могуць асобы, не маладзейшыя за 14 гадоў, за выключэннем жылых і пешаходных зон. Забараняецца перамяшчацца на сродках персанальнай мабільнасці ў стане ап'янення, а таксама не трымацца за руль (пры яго наяўнасці).

На сродках персанальнай мабільнасці неабходна рухацца па веладарожцы, якая абазначаецца або спецыяльным дарожным знакам, або дарожнай разметкай, або зялёным колерам. Калі веладарожка адсутнічае, дазваляецца перамяшчацца па тратуары, пешаходнай дарожцы ці абочыне дарогі. Праезную частку на сродках персанальнай мабільнасці патрэбна перасякаць па веласіпедным пераездзе, аб наяўнасці якога будзе сведчыць або спецыяльны знак, або адпаведная дарожная разметка.

## СТАТУС І ПЕРАВАГІ ПЕШАХОДАЎ

Да пешахода цяпер прыраўноўваецца і той, хто рухаецца на сродках персанальнай мабільнасці. Нягледзячы на тое, што ўдзельнічаць у дарожным руху яны будуць па правілах веласіпедыста, за імі замацоўваецца статус пешахода.

Перавага пешаходу, які рухаецца па нерэгулюемым пешаходным пераходзе, лічыцца прадастаўленай, калі адлегласць паміж транспартным сродкам і пешаходам, які набліжаецца, складае не менш за дзве паласы, у тым ліку адну паласу і трамвайныя пуці спадарожнага напрамку, адну паласу і раздзяляльную паласу або зону, адну паласу і астравок бяспекі. Адным словам, калі пешаходны пераход размешчаны на шырокай дарозе, якая мае чатыры і больш палос, кіроўцу аўтатранспарту неабавязкова чакаць, пакуль пешаход, які толькі падышоў да перахода, пяройдзе на іншы бок. Аднак важна не грэбаваць гэтым правілам і аб'ектыўна разлічыць магчымасці свайго транспартнага сродку, прадугледзець дзеянні пешахода. Лепш не рызыкаваць.



Знак «Рух на сродках персанальнай мабільнасці забаронены».

Пешаход павінен рухацца па тратуары або пешаходнай дарожцы. У выпадку іх адсутнасці — па веласіпеднай дарожцы або па абочыне. Раней па абочыне пешаход меў права ісці толькі пры адсутнасці тратуара, пешаходнай або веласіпеднай дарожак. Цяпер, калі ёсць толькі веладарожка, ён мае права выбару: або ісці па ёй, або па абочыне.

У цёмны час сутак пры руху па краі праезнай частکі пешаход па-ранейшаму абавязаны абазначаць сябе святлоадбівальным элементам (флікерам). Прытрымлівацца гэтага патрабавання неабходна будзе і падчас руху на абочыне. Абазначаць сябе флікерамі патрэбна і пры перамяшчэнні на сродку персанальнай мабільнасці ў цёмны час сутак або пры недастатковай бачнасці. Пры гэтым на самім сродку павінна быць устаноўлена і ўключана фара (ліхтар), якая дазваляе своечасова выявіць перашкоду для дарожнага руху. Рухацца на сродку персанальнай мабільнасці пешаходу рэкамендуецца ў ахоўным шлеме.

Пры перасоўванні на ролікавых каньках, лыжах або іншым спартыўным інвентары, сродках персанальнай мабільнасці пешаход абавязаны перасякаць праезную частку дарогі са скорасцю пешахода, які ідзе, пераканаўшыся пры гэтым, што выхад на праезную частку дарогі бяспечны.

З'яўляецца новы абавязак пешахода — па патрабаванні супрацоўніка ДАІ прайсці агляд на прадмет



Знак «Веласіпедная і пешаходная дарожкі».

вызначэння стану алкагольнага ап'янення або стану, выкліканага ўжываннем наркатычных ці псіхатропных рэчываў.

## ПАСАЖЫР МАТАЦЫКЛІСТА — ТОЛЬКІ ЦВЯРОЗЫ

З новай рэдакцыі Правілаў дарожнага руху выключаны такія тэрміны, як дзяржаўны тэхнічны агляд, эстакада. Аднак узніклі і новыя паняцці. Напрыклад, зона з абмежаваннем максімальнай скорасці (з якой скорасцю рухацца, паведаміць дарожны знак), камбінаваны транспартны сродак (буксіроўка транспартнага сродку грузавым аўтамабілем або седлавым цягачом і іншым). Пры гэтым легкавы аўтамабіль, які буксіруе іншы легкавы аўтамабіль, не з'яўляецца камбінаваным транспартным сродкам.



Фота Лізаветы ГОЛАД.

Для тых, хто перамяшчаецца на сродках персанальнай мабільнасці, у новай рэдакцыі ПДР прадугледжаны шэраг навацый.

Цяпер удзельнікі дарожнага руху маюць права на абскарджанне не толькі дзеянняў (бяздзейнасці), а і рашэнняў дзяржаўных органаў, якія ажыццяўляюць рэгуляванне і кіраванне ў сферы дарожнага руху, забеспячэнне яго бяспекі.

Кіроўца таксі можа не прышпільвацца ў населеным пункце толькі падчас перавозкі пасажыра. Калі ён едзе адзін на заказ або карыстаецца транспартным сродкам у сваіх мэтах, з заўтрашняга дня кіроўца таксі абавязаны будзе прышпільвацца рэменем бяспекі.

Яшчэ адно важнае новаўвядзенне — перш чым пачаць рух, кіроўца мапеда або матацыкла, які перавозіць пасажыра, павінен пераканацца ў яго цвярозасці. Калі пасажыр знаходзіцца ў стане алкагольнага або наркатычнага ап'янення, перавозіць яго катэгарычна забараняецца. Аднак дадзенае правіла не распаўсюджваецца на перавозку такога пасажыра ў бакавым прычэпе матацыкла.

Звяртаем увагу, што забараняецца перавозіць дзяцей да 12 гадоў на матацыкле, мапедзе, у тым ліку ў бакавым прычэпе да іх. Нельга будзе перавозіць пасажыраў і на веласіпедзе, за выключэннем выпадку перавозкі дзяцей ва ўзросце да сямі гадоў. Пры гэтым дзіця павінна знаходзіцца на дадатковым спецыяльна абсталяваным сядзенні, якое фіксуе (засцерагае) ногі дзіцяці. На галаве непаўналетняга пасажыра ў абавязковым парадку павінен быць ахоўны шлем.

Забараняецца рухацца на веласіпедзе, мапедзе, матацыкле на адным коле, а таксама не трымаючыся за руль абедзвюма рукамі, за выключэннем выпадку падачы сігналу рукой. Таксама не дазваляецца рухацца на згаданых транспартных сродках, не трымаючы ногі на педалях або падножках.

Новы пункт у ПДР — нельга навучаць кіраванню механічнымі транспартнымі сродкамі на ўчастках вуліц і дарог, дзе тое забаронена. Пералік такіх месцаў будзе вызначаны Міністэрствам унутраных спраў.

## ДА ЎВАГІ КІРОЎЦАЎ

Навацый для кіроўцаў транспартных сродкаў у новай рэдакцыі Правілаў дарожнага руху няшмат. У прыватнасці, у ПДР дабавіліся два новыя віды манеўраў — уезд транспартнага сродку на трамвайныя пуці і з'езд з іх. Сігнал павароту цяпер трэба будзе паказваць і тады, калі заязджаеш на трамвайныя пуці спадарожнага напрамку, а таксама перад выездам з іх.

Кіроўца абавязаны прадаставіць перавагу пешаходам на нерэгулюемых і рэгулюемых пешаходных пераходах і веласіпедных пераездах у выпадку іх руху на сродках персанальнай мабільнасці, а таксама саступіць дарогу веласіпедыстам пры адначасовым для кіроўцаў і пешаходаў/веласіпедыстаў дазвольным сігнале рэгуліроўшчыка або святлафора.

Змяненні датычацца ўезду на скрыжаванне, дзе арганізаваны кругавы рух. Падача сігналу светлавымі ўказальнікамі павароту цяпер не патрабуецца. Аднак пры перастройванні на крузе або з'язджаючы з такога скрыжавання, сігнал павароту па-ранейшаму абавязковы.

Спыненне і стаянка цяпер забараняюцца толькі на пуцеправодах (раней яшчэ і на мастах, эстакадах) і пад імі. На мастах, калі тое прадугледжана дарожнай разметкай, — дазваляецца. Аднак тут важна не пераблытаць мост з пуцеправодам. Мост — збудаванне над ракой або іншай геаграфічнай перашкодай. Калі пад мостам ёсць яшчэ адна дарога, то гэты мост, згодна з ПДР, аўтаматычна ператвараецца ў пуцепровад.

Цяпер кіроўцы павінны вытрымліваць бакавы інтэрвал не толькі з транспартнымі сродкамі, якія рухаюцца на суседніх палосах руху, а і з іншымі ўдзельнікамі дарожнага руху, якія стаяць або рухаюцца па дарозе (тыя ж веласіпедысты і матацыклісты). Актуальнае дадзенае патрабаванне і ў адносінах да тэхнічных сродкаў арганізацыі дарожнага руху і аб'ектаў: бакавы інтэрвал неабходна вытрымліваць і з дарожнымі знакамі, адбойнікамі і іншым. Праўка дастаткова сучасная і карысная.

Калі падчас руху кіроўцу спасцігла непрыемнасць і ёсць неабходнасць ліквідаваць няспраўнасць транспартнага сродку непасрэдна на праезнай частцы, рабіць гэта трэба будзе ў адзенні павышанай бачнасці са святлоадбівальнымі элементамі. Раней такое патрабаванне мела толькі рэкамендацыйны характар. Цяпер яно актуальнае як у цёмны, так і ў светлы час сутак.

Стаянка забараняецца ў месцах, абсталяваных станцыямі для зарадкі электрамабіляў. Паркавацца на гэтых месцах не маюць права ніякія транспартныя сродкі, у тым ліку электрамабілі. Апошнія — толькі з мэтай падзарадкі. У іншым выпадку транспартны сродак можа быць эвакуіраваны. Такое развіццё падзей будзе чакаць і таго кіроўцу, які паставіў свой транспартны сродак на месца, прызначанае для інвалідаў. Гэта не закране аўтамабіляў, абазначаных адпаведным знакам.

## АБАВЯЗКОВА СА СВЯТЛОМ!

І яшчэ адна вельмі важная навацыя. Калі раней перад пачаткам і заканчэннем навучальнага года Дзяржаўная аўтаінспекцыя разнастайнымі спосабамі апавяшчала кіроўцаў аб уключэнні блізкага святла фар у дзённы час сутак, то цяпер гэты момант замацаваны заканадаўствам. І адгаворкі накшталт «не бачыў» і «не чуў» не прымаюцца. Зафіксаваны канкрэтныя даты, у якія, сеўшы за руль свайго транспартнага сродку, кіроўца абавязаны ўключыць блізкае святло фар нават у светлы час сутак: у перыяд з 25 мая да 5 чэрвеня і з 25 жніўня да 5 верасня. Такім чынам, акцыі, прымеркаваныя да пачатку і заканчэння навучальнага года, якія традыцыйна праводзяцца супрацоўнікамі ДАІ, замацоўваюцца ў Правілах дарожнага руху.

Больш падрабязна азнаёміцца са змяненнямі і дапаўненнямі ў Правілы дарожнага руху можна будзе на Нацыянальным прававым партале (pravo.by).

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Дата на календары

# У АДКАЗЕ ЗА ЖЫЦЦЁ І МАЁМАСЦЬ ЧАЛАВЕКА

## Дэпартаменту аховы МУС спаўняецца 70 гадоў

**Гісторыя службы пазаведамаснай аховы (Дэпартамент аховы) пачалася з 29 кастрычніка 1952 года, калі выйшла Пастанова ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР «Аб выкарыстанні ў прамысловасці, будаўніцтве і іншых галінах народнай гаспадаркі работнікаў, якія вызваляюцца з ахоў, і мерах па паляпшэнні справы арганізацыі аховы гаспадарчых аб'ектаў міністэрстваў і ведамстваў». Сёння супрацоўнікі Дэпартамента аховы працягваюць слаўныя традыцыі старэйшых пакаленняў.**

Пастанова Савета Міністраў СССР ад 8 лютага 1965 года паклала пачатак пераўзбраенню новымі тэхнічнымі сродкамі ахоўна-пажарнай сігналізацыі і стварэнню падраздзяленняў міліцыі пазаведамаснай аховы. Удасканаленню дзейнасці садзейнічала ўстаноўка пультаў цэнтралізаванага назірання (ПЦН). Прымаліся актыўныя меры па распрацоўцы і ўкараненні найноўшых прыбораў ахоўнай сігналізацыі, якія забяспечваюць высокую эфектыўнасць і надзейнасць.

Для паляпшэння аховы асабістай маёмасці насельніцтва ў сакавіку 1969 года МУС СССР быў выдадзены Загад «Аб арганізацыі работы па ахове кватэр грамадзян з дапамогай тэхнічных сродкаў сігналізацыі». Па магчымасці, адначасова прадпісвалася праводзіць установку пажарных датчыкаў.

23 снежня 1998 года Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь Аляксандрам Лукашэнкам выдадзены Дэкрэт № 24 «Аб мерах па ўдасканаленні ахоўнай дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь», дзякуючы якому істотна павысілася роля дзяржаўных структур у сферы ахоўнай дзейнасці. Гэтым дэкрэтам прадугледжвалася сертыфікацыя сродкаў і сістэм аховы, істотна змяніўся прававы механізм ліцэнзавання.

4 чэрвеня 2004 года выдадзены Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 268 «Аб некаторых пытаннях органаў і падраздзяленняў унутраных спраў Рэспублікі Беларусь», якім было зацверджана Палажэнне аб Дэпартаменце аховы МУС, вызначаны асноўныя задачы, функцыі, паўнамоцтвы і прыярытэтныя напрамкі арганізацыі дзейнасці падраздзялення. Гэты дакумент з'явіўся новай вяхой у гісторыі службы аховы. На аснове аб'яднання «Ахова» пры МУС створаны Дэпартамент аховы МУС.

Сёння Дэпартамент аховы з'яўляецца адной з самых шматлікіх структур у сістэме МУС з агульным штатам больш як 34 тысячы чалавек. Затрыманне правапарушальнікаў па гарачых слядах з'яўляецца яго прыярытэтнай задачай.

На пастаяннай аснове, удасканальваючы свае навыкі і ўменні, непасрэдны ўдзел у раскрыцці злачынстваў бяруць спецыялісты-кінолагі са службовымі сабакамі. Толькі ў першым паўгоддзі 2022 года спецыялісты-кінолагі 457 разоў выбывалі да месцаў здарэнняў і ў выніку сваіх прафесійных дзеянняў садзейнічалі раскрыццю 62 злачынстваў.

Пад аховай дэпартамента знаходзіцца амаль 200 тысяч аб'ектаў і жылых дамоў (памяшканняў) грамадзян. Сярод іх — пабудовы гісторыка-культурнай спадчыны, прадпрыемствы і заводы, усе адміністрацыйныя будынкі органаў улады.

— У сваёй дзейнасці падраздзяленні аховы імкнуцца выкарыстоўваць самыя сучасныя сусветныя рашэнні і тэхналогіі сувязі, — адзначыў **начальнік Дэпартамента аховы МУС генерал-маёр міліцыі Аляксандр ШЭПЕЛЕЎ**. — Камп'ютарнай тэхнікай, планшэтамі ў аўтамабілях груп затрымання, лічбавымі сістэмамі радыёсувязі з выкарыстаннем усіх наяўных каналаў сувязі для аказання ахоўных паслуг у Дэпартаменце аховы ўжо нікога не здзівіш — гэта для нас факт, які адбыўся. Ужо поўнасцю завершана работа па абсталяванні падраздзяленняў аўтаматызаванымі рабочымі месцамі для груп затрымання. У аўтамабілях нарадаў устаноўлены бартавыя камп'ютары, якія дублююць функцыі пульта цэнтралізаванага назірання, што значна скарачае час перадачы сігналаў трывогі, і супрацоўнікі адразу бачаць дзеянне ахоўнай сігналізацыі на аб'екце. Такім чынам, апавяшчэнне паступае непасрэдна, істотна аптымізуюцца працэсы пастаноўкі задач дзяжурным. Натуральна, значна скарачаецца і час прыбыцця на месца.

Дзейнасць згаданага найважнейшага падраздзялення ў сістэме жыццезабеспячэння насельніцтва найперш ацэньваюць людзі. І, маркуючы па запатрабаванасці паслуг, якія аказвае Дэпартамент аховы, гэтая ацэнка станоўчая. Кожны дзень супрацоўнікам падраздзялення давяраюць сваё жыццё, здароўе і маёмасць тысячы людзей, а гэта дарагога варта.

Міліцыя ў асобах

# АДНА ПРАФЕСІЯ НА ДВАІХ

## У Дэпартаменце аховы служыць трэцяе пакаленне сям'і Лейчанкаў

**Калі нехта з сужэнцаў ЛЕЙЧАНКАЎ затрымліваецца на рабоце або працуе ў выхадны дзень, непаразуменняў у сям'і ніколі не ўзнікае. Ні муж, ні жонка нават пытанняў не задае, бо добра ведае на іх адказ. Справа ў тым, што Дзмітрый і Вікторыя абралі адну прафесію на дваіх — яны служаць у міліцыі. Нават у адным падраздзяленні — Маскоўскім аддзеле (г. Мінска) Дэпартамента аховы Міністэрства ўнутраных спраў.**



### ДЗЯДУЛЕЎ ПРЫКЛАД

Мы сустрэліся з сям'ёй Лейчанкаў у аддзеле, хоць Вікторыя непасрэдна нясе службу ў Доме правасуддзя. Дзяўчына з дзяцінства марыла служыць у міліцыі. Усе мужчыны з яе сям'і — дзядуля, бацька і брат — з'яўляюцца супрацоўнікамі органаў унутраных спраў.

«Дзядуля і бацька заўсёды насілі форму, — успамінае Вікторыя Лейчанка. — Памятаю, збіраюцца на службу, а я з захапленнем на іх гляджу. Яны былі героямі ў маіх вачах, вельмі імі ганарылася. Дзядулі ўжо няма з намі, бацька знаходзіцца ў запасе».



Парушыць сямейную дынастыю яна не магла і не хацела. Пасля школы паступіла ў Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь на юрыдычны факультэт. З такой адукацыяй яе з задавальненнем узялі ў Маскоўскі аддзел Дэпартамента аховы. У свой час у гэтай структуры служыў і дзядуля Вікторыі. Уладзімір Гаралевіч з'яўляўся начальнікам Бешанковіцкага аддзялення Дэпартамента аховы. А першым кіраўніком гэтага падраздзялення быў дзядуля Дзмітрыя — Афанасій Лейчанка. Такім чынам, іх унукі не проста працягнулі міліцэйскую дынастыю, а таксама звязалі сваё жыццё з Дэпартаментам аховы.

### НА СВАІМ МЕСЦЫ

Дзмітрый Лейчанка ў міліцыю прыйшоў пасля арміі. Служыў у адным з элітных падраздзяленняў Узброеных Сіл — у роце ганаровай варты. «Гэта быў асаблівы этап у маім жыцці, — расказвае Дзмітрый. — Служыць у роце ганаровай варты няпроста: гэта пастаянныя трэніроўкі, знаходжанне ў цэнтры ўвагі. Найбольш запомніўся ўдзел у парадзе. Вельмі пачэсна прадстаўляць сваё падраздзяленне перад Прэзідэнтам, усёй краінай».

Пасля службы ў арміі, асабліва ў элітным падраздзяленні, дзверы ў міліцыю заўсёды адчыненыя. Скарыстаўся такой магчымасцю і Дзмітрый Лейчанка. Яшчэ ў войску пачаў задумвацца аб будучым працаўладкаванні. Не паспеўшы дэмабілізавацца, трапіў на навучанне ў Цэнтр павышэння кваліфікацыі кіруючых работнікаў і спецыялістаў Міністэрства ўнутраных спраў — ён, як і яго жонка, марыў з дзяцінства служыць у міліцыі.

> **«Дзядуля і бацька заўсёды насілі форму... Яны былі героямі ў маіх вачах, вельмі імі ганарылася».**

Пасля навучання Дзмітрый трапіў у Маскоўскі аддзел Дэпартамента аховы, дзе дагэтуль нясе службу.

Спачатку працаваў кіроўцам у групе затрымання, цяпер — старшына групы тылавога забеспячэння: малады чалавек выдае асабоваму складу спецсродкі, адказвае за захоўванне зброі. Дзмітрый Лейчанка марыць аб афіцэрскіх пагонах. Невыпадкова ён паступіў у Магілёўскі інстытут МУС, дзе вучыцца завочна.

Вікторыя — міліцыянер батальёна міліцыі. Яна нясе службу ў Доме правасуддзя. Асноўным абавязкам дзяўчыны з'яўляецца ахова грамадскага парадку. «У суд прыходзяць розныя людзі, не заўсёды яны знаходзяцца ў адэкватным стане, — расказвае супрацоўнік Дэпартамента аховы. — Часта паміж людзьмі ўзнікаюць спрэчкі, мы іх спрабуем урэгуляваць. Нярэдка на судовыя пасяджэнні з'яўляюцца і ў стане алкагольнага ап'янення. Мы не павінны дапусціць такіх людзей у будынак. У нас пры сабе ёсць зброя, спецсродкі. Заўсёды можна націснуць трывожную кнопку — і на працягу некалькіх хвілін прыбудзе нарад групы затрымання». Пры гэтым, як заўважае Вікторыя, дэбашыры, асабліва калі гэта мужчыны, звычайна не пярэчаць дзяўчыне-міліцыянеру і становяцца больш згаворлівымі ў размове з ёй.

Як лічаць маладыя людзі, нягледзячы на розныя сітуацыі, работа яшчэ больш іх згуртоўвае. «Можам абмеркаваць адно з адным некаторыя моманты, — удакладняе Вікторыя. — Я ў курсе спецыфікі дзейнасці Дзімы, таму калі ён позна вяртаецца дамоў, ведаю, дзе ён і чым заняты».

Вікторыя і Дзмітрый выхоўваюць пяцігадовую дачку Сафію. Дзяўчынка кажа, што таксама будзе працаваць у міліцыі. «Малая яшчэ, каб вызначацца з прафесіяй, але мы не супраць», — у адзін голас кажуць бацькі. Яны ўсё паспяваюць: і службовыя абавязкі своечасова ды добрасумленна выконваць, і час з сям'ёй праводзіць. Наведваюць каток, ходзяць на хакей, рэгулярна ездзяць на малую радзіму. А яшчэ з ахвотай удзельнічаюць у творчым жыцці міліцыі. Нядаўна Вікторыя і Дзмітрый Лейчанкі сталі прызёрамі рэспубліканскай акцыі МУС «Сям'я! Служым разам!», дзе былі адзначаны ў намінацыі «Самая вытанчаная сям'я». І тут складана не пагадзіцца. Прычым да іх службовых абавязкаў гэта таксама адносіцца.

**Фота з архіва герояў публікацыі.**

**Матэрыялы выпуску падрыхтавала Вераніка КАНЮТА.**

Шануй сваё!

# «...І КОЖНАЯ РАНІЦА — ДОБРАЯ»

*«Амаль год таму ў маёй хаце з'явілася цудоўная рэч: нявестка падарыла арыгінальны адрыўны каляндар на 2022 год. Ды не проста каляндар, а каляндар-слоўнічак. Зроблены ён з густам, прыгожа і з душой. На кожнай старонцы над яркай і натхняльнай ілюстрацыяй — цікавае беларускае слоўца (ці фразеалагізм) з перакладам на рускую мову. Побач — прыклад яго ўжывання з мастацкай літаратуры. Акрамя таго, у календары шмат філасофскіх цытат, народных прыказак і прымавак. Напрыклад, «Кожны чалавек носіць сваё неба з сабой» (У. Караткевіч), «Шчасце можа быць поўным толькі тады, калі ўсе вакол цябе адчуваюць сябе шчаслівымі», «Добра быць у дарозе, якую ты сам сабе выбіраеш» (Я. Колас), «Толькі чыстыя сэрцы бачаць сапраўдную прыгажосць» (Я. Брыль), «Трэба дома бываць часцей, трэба дома бываць не госцем, каб душою не ачарсцвець, каб не страціць святое штосьці» (Р. Барадулін), «Усё, што кранае мяне, падобнае на мяне» (А. Разанаў)...*

*А якія ў слоўнічку словы?! Багоўка, веснічкі, вэлюм, філіжанка, кужаль, вехаць, бразготка, слота, блазан, сутарэнне... Факт, што цяпер кожная раніца ў мяне — добрая, бо пачынаецца з нечага вельмі свайго, беларускага.*

*Дарэчы, каляндар можна не толькі павесіць на сцяну, але і замацаваць на рабочым стале або падаконні. У камплекце ёсць два магнікі, якімі я прымацоўваю на халадзільнік асобныя ўпадабаныя старонкі...*

*Іх, такіх цёплых, з надыходам восені ды зімы застаецца ўсё менш і менш: год канчаецца. Хацелася б мець такі каляндар на новы год. Але ж ці з'явіцца ён у продажы? Каб нагадваць забытыя слоўцы, каб засвойваць новыя, а што патрэбна не менш — штодзень, хоць крыху, узнімаць настрой...»*

**Таццяна МАРКАВА,**

*г. Віцебск.*



Каб адказаць на пытанні шаноўнай чытачкі, «Звязда» звязалася з **Яўгеніяй ДУДЗЯНКОВАЙ, стваральніцай календара** не толькі на год сыходзячы, але і на наступны.

— Гэтым разам у ім, апроч слоў, прыказак і прымавак, цытат, фразеалагізмаў, з'явіліся беларускія скорагаворкі, — расказвае Яўгенія. — Словы ўсе новыя, многія вельмі самабытныя і сёння ўжо рэдка ўжываныя. Да таго ж у календара новы дызайн старонак з падзелам па поры года, новая вокладка, новы лагатып «Лёгкай мовы».

А пачыналася ўсё з таго, што гадоў дзесяць назад «Укантакце» была створана суполка «Беларуская мова для лянівых», бо трэба ж, як прызнала Яўгенія, каб родную мову ведалі і яны... Таму інфармацыя падавалася ў вельмі простай і сціслай форме: прыгожы фотаздымак, беларускае слова, пераклад яго на рускую мову.

Наступным крокам было пашырэнне аўдыторыі: Яўгенія стварыла моўны блог у «Інстаграме».

— «Беларуская мова для лянівых» вельмі хутка заняла нішу аднаго з самых папулярных беларускамоўных блогаў, — расказвае аўтар. — На сёння ў яго амаль 45 тысяч падпісчыкаў. Праўда, першапачатковая назва падалася задоўгай. Каб суполку прасцей было адшукаць у сацсетках, я перайменавала яе ў «Лёгкую мову», бо матэрыял і сапраўды стараюся падаваць цікава і з гумарам. Да таго ж я пастаянна кантактую са сваёй аўдыторыяй, з задавальненнем адказваю на кожны каментарый і паведамленне. Блог для мяне — сапраўдная аддушына, а кожны пост — вельмі важны і значны. Я магу гадзінамі падбіраць выяву пад цікавае беларускае слоўца, каб яно ўсё разам лягло на душу — спачатку мне. І толькі пасля ўжо дзялюся з падпісчыкамі. Яны ў мяне вельмі ўдумлівыя, цікаўныя, задаюць пытанні, уступаюць у дыскусіі.

З ростам колькасці падпісчыкаў да Яўгеніі пачалі паступаць і прапановы аб супрацоўніцтве. У прыватнасці, у канцы 2020 года мінская друкарня прапанавала выпусціць календары-слоўнічкі. Так блог @lohkaja_mova з «Інстаграма» перабраўся на старонкі адрыўнога календара.

— Я вельмі люблю гартаць слоўнікі, а таксама чытаць па-беларуску, — працягвае дзяўчына. — І пры гэтым пастаянна трымаю пад рукой нататнік і аловак. Калі сустракаю цікавае слоўка — абавязкова выпісваю. На сапраўдныя моўныя «перлінкі» найбольш багатая, як мне здаецца, творчасць Караткевіча... А здараецца і наадварот: спачатку знаходжу выяву, якая вельмі падабаецца, і ўжо да яе падбіраю слова. У кожную з 365 старонак і першага і другога календара «Лёгкая мова» я ўклала часцінку сваёй душы. Рада, што людзі гэта адчуваюць. Быў чалавек, які заказаў на падарункі аж 24 календары. Прыемна, што «слоўнічкі» набываюць настаўнікі і вешаюць у сябе ў класах, каб вучні штодзень адкрывалі для сябе новае слова.

**Надзея ДРЫНДРОЖЫК.**



Наўздагон

# «ДЗЕЦІ — САМЫ ЯСКРАВЫ ПАКАЗЧЫК ТАГО, наколькі плённым было жыццё»

**Падчас добрых восеньскіх свят — Дня маці, Дня бацькі — асаблівыя словы падтрымкі хочацца выказаць бацькам, якія гадуюць дзяцей з інваліднасцю, з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця. У нашай спецыяльнай школе-інтэрнаце 117 такіх вучняў. І для кожнага з іх (за свой клас пішу з усёй адказнасцю) мама, тата — самыя-самыя!**

Мама Лідзія Уладзіміраўна (з этычных меркаванняў не буду называць прозвішчаў) сама выпускніца нашай школы. Цяпер яна працуе тут прыбіральшчыцай, а сын Віталік — вучыцца. Хлопчык ён выхаваны, задумённы, вельмі любіць сваю сям'ю, дзе гадуецца трое дзетак. А клапоціцца пра іх найбольш мама, «бо яна — залатая». Так гаворыць Віталік.

Лёша і Саша — браты-блізняты і сапраўдныя мужчыны. Ім ёсць на каго раўняцца. Бацька блізнят — ваеннаслужачы. І таму сыны змалку прывучаюцца да парадку, ведаюць, што за свае ўчынкі трэба ўмець адказваць.

У гэтай сям'і вялікая ўвага аддаецца спорту: фізічным практыкаванням, валейболу, баскетболу. Пасля школы хлопчыкі (Аляксей — дакладна) бачаць сябе абаронцамі Айчыны, і калі дарослыя, а найперш бацькі, вераць у сілы сваіх дзяцей — усё магчыма.

...Асаблівыя дзеці — асаблівыя мары і шляхі да іх здзяйснення. Лерачка марыць аб тым, што разам з мамай пабудуе дом у выглядзе сэрца. На пытанне, для каго той дом, хто ў ім будзе жыць, дзяўчынка адказвае: «Людзі, у якіх добрае сэрца, такое, як у мамы».

Маці дзяўчынкі — па прафесіі і сапраўды будаўнік, упэўненая, смелая жанчына, выхоўвае траіх дзяцей.



А ў Наталлі Іванаўны іх двое: старэйшаму — 24 гады, малодшаму — дзевяць. Менавіта маміны любоў і вера дапамаглі хлопчыку вырвацца з лап хваробы. А яшчэ, як прызнаўся бацька хлопчыка, — яе бясконцая дабрыня і мудрасць, уменне зразумець і дараваць.

...Падчас аднаго з класных мерапрыемстваў, на якім, апроч дзяцей, былі і бацькі, я спытала ў іх, дарослых, што галоўнае ў выхаванні? Тата Алёшы адказаў тады: праца і павага да старэйшых, асабліва — да жанчын.

У гэтай сям'і іх, можна сказаць, дзве: мама і маленькая Даша. А вось мужчын — чацвёра: бацька і трое сыноў, якія кажуць, што мама для іх — нібы тая ікона, на якую моляцца, у якой у цяжкія хвіліны просяць падтрымкі і дапамогі. Што напраўду так (у гэтай сям'і, як і ў абсалютнай большасці іншых): мама — сімвал працавітасці і адказнасці. А дзеці — бадай, самы яскравы паказчык таго, наколькі плённым было жыццё.

Не ўсе, на вялікі жаль, гэта разумеюць, і таму ў краіне ёсць сіроты пры жывых бацьках... Як ёсць, на шчасце, і бацькі, згодныя выхоўваць не толькі сваіх дзяцей, але і чужых. Вось і двое нашых выхаванцаў (Мілена са сваім старэйшым братам Цімурам) не так даўно сталі жыць у дзіцячым доме сямейнага тыпу. Іх новыя бацькі Таццяна Анатолеўна і Павел Пятровіч сустрэлі навенькіх вельмі цёпла і хутка сталі для іх самымі блізкімі. Ва ўсякім разе, падчас падрыхтоўкі да Дня маці Мілена намалявала партрэт Таццяны Анатолеўны і напісала пад ім галоўнае слова: «Мама».

...Я — таксама маці і лічу, што гэта найвялікшае шчасце: дарыць жыццё, бачыць свой працяг у дзецях. І, вядома ж, вучнях: амаль 25 гадоў я працую ў школе-інтэрнаце. Выхаванне дзяцей — цяжкая, але важная работа. Асабліва калі пашчасціць знайсці падыход, наладзіць кантакт, даведацца пра захапленні... А ўрэшце — убачыць станоўчы вынік. Вельмі прыемна, што нашы выпускнікі падтрымліваюць сувязь са школай-інтэрнатам, з педагогамі.

**Іна Петушкова,**

*г. Навагрудак.*

Чалавек — чалавеку

# ДЗВЕ МІНУТЫ АБЕДУ

**Прачытала ў «Звяздзе», што сёлета зноў быў высокі конкурс у медыцынскія навучальныя ўстановы, і парадавалася: падумала, што ў прафесію па-ранейшаму ідзе найлепшая моладзь: самыя добрасумленныя, самыя працаздольныя выпускнікі школ.**

Так, напэўна, было заўсёды. Але ж цяпер я хачу расказаць аб тым, што насцярожвала.

Мая прыяцелька (назавём яе Надзеяй Іванаўнай) не так даўно выйшла на пенсію. Да таго займала немалую пасаду, многім дапамагала, была, што называецца, паважаным чалавекам, а тут...

Мы сустрэліся ў паліклініцы, прыселі, каб перакінуцца нейкім словам, як бачым, па калідоры ідзе знаёмая доктарка. Надзея загадзя прыўстала, каб павітацца з ёю, бо даўно і добра ведала... У адказ жа — ні павароту галавы, ні слова, ні паўслова...

«Не пазнала», — вырашыла мая Іванаўна. «І не дзіва, — сказала я, каб падтрымаць яе, — мы ж у масках, у шапках». — «Трэба скінуць, зайсці ў кабінет», — вырашыла Надзея, ужо кіруючы ў канец калідора, след за белым халатам...

І потым — прычым адразу ж — назад, прычым настолькі разгубленая... «Што сталася?» — спытала я.

«Ты не паверыш, — мусіць, сама нічога не разумеючы, зашаптала жанчына. — Я не паспела дзверы адчыніць, як пачула загад... зачыніць, бо ў яе абед... Яшчэ дзве мінуты... Дзве... Уяўляеш? Хіба можна з-за іх — вось так?»

Я суцяшала жанчыну як магла: паўтарала, што доктар і сапраўды яе не пазнала, што ў яе маглі быць непрыемнасці, што ў медыкаў цяпер вялікія нагрузкі, што нялёгка працаваць з людзьмі здаровымі, а ўжо з хворымі...

Надзея слухала мяне і не слухала, верыла і не верыла: не магла змірыцца з тым, што пачула.

...Напэўна, гэта было нейкае непаразуменне, проста недарэчны выпадак, але ж як хацелася б, каб іх, вось такіх, не было зусім.

**А. Баранава,**

*г. Магілёў.*

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
26 кастрычніка 2022 г. № 41 (677)
Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

# ПРАФАРЫЕНТАЦЫЯ, ІНКЛЮЗІЎНАЯ АДУКАЦЫЯ, ЦЭНАЎТВАРЭННЕ

## Рабочая паездка Старшыні Савета Рэспублікі ў Полацк і Наваполацк была тэматычна насычаная

**НА мінулым тыдні Старшыня Савета Рэспублікі Наталля Качанава ўзяла ўдзел у пасяджэнні Полацкага райвыканкама, прысвечаным рэалізацыі Дзяржаўнай праграмы «Адукацыя і маладзёжная палітыка» на 2021—2025 гады і сустрэлася з працоўным калектывам будтрэста № 16 горада Наваполацка. Карэспандэнт «МС» таксама знаходзілася са спікерам верхняй палаты парламента ў Полацку і дзеліцца падрабязнасцямі.**







Фота БелТА.

### Як замацаваць маладога спецыяліста?

Галоўнай тэмай сустрэчы з актывам раёна сталі ўмовы і метады замацавання маладых спецыялістаў на месцах. Наталля Качанава адзначыла, што кадравае пытанне вельмі важнае. «Усе мерапрыемствы, якія вы праводзіце ў раёне, павінны быць нацэлены на тое, каб моладзь цаніла сваю малую радзіму, вярталася сюды і заставалася тут. Тады ў вас будзе і напаўняльнасць маладымі кадрамі. Гэта ключавая работа», — зрабіла акцэнт Старшыня Савета Рэспублікі.

Намеснік старшыні Полацкага райвыканкама па сацыяльных пытаннях Святлана Валюшкіна адзначыла, што замацаванне маладых спецыялістаў з розных сфер пасля абавязковых двух гадоў размеркавання знаходзіцца на высокім узроўні — 72 працэнты, аднак дадзены паказчык сярод педагогаў-псіхолагаў невялікі — толькі 50. Адным са спосабаў папаўнення дэфіцыту кадраў з'яўляецца навучанне спецыялістаў па мэтавым дагаворы, па якім пасля атрымання дыплома выпускнік ВНУ або ССНУ павінен будзе адпрацаваць на першым месцы работы пяць гадоў. У гэтым кірунку актыўна працуе Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт імя Еўфрасінні Полацкай. Па словах рэктара Юрыя Раманоўскага, сёння ўніверсітэт вядзе перагаворы з найбуйнейшым прадпрыемствам рэгіёна ААТ «Нафтан» аб заключэнні мэтавых дагавораў для выпускнікоў. Перад пяцігадовым размеркаваннем студэнты абіраюць тэмы курсавых і дыпломных работ, звязаныя са спецыфікай работы прадпрыемства, і праходзяць практыку на аб'екце, які пасля навучання стане іх першым рабочым месцам.

Таксама супрацоўнікі ўпраўлення адукацыі райвыканкама лічаць, што трэба праводзіць індывідуальную работу з дзецьмі, арганізоўваць ранняе тэсціраванне для прафарыентацыі, а да такой работы неабходна падключаць непасрэдна прадпрыемствы Полацкага рэгіёна: арганізоўваць экскурсіі на вытворчыя аб'екты, знаёміць моладзь з перадавікамі, каб школьнікі абіралі будучую прафесію не столькі па буклетах, колькі па асабістых адчуваннях. Наталля Качанава заўважыла, што педагогам неабходна зрабіць ухіл на папулярызацыю рабочых спецыяльнасцяў, якія карыстаюцца попытам менавіта на Полаччыне, зыходзячы з кірунку дзейнасці рэгіянальных прадпрыемстваў-флагманаў. «Тут створаны ўсе неабходныя ўмовы для замацавання кадраў: можна атрымаць вышэйшую адукацыю, у Полацку і Наваполацку дастаткова рабочых месцаў, плануецца адкрыццё новага дзіцячага садка на 200 месцаў — гэта і трэба даносіць да нашай моладзі. Неабавязкова ехаць на пошукі лепшага жыцця далёка, важней стаць высокакваліфікаваным спецыялістам і сваімі працоўнымі дасягненнямі зрабіць малую радзіму лепшай», — падкрэсліла Наталля Іванаўна.

### Інклюзія не намінальная, а рэальная

Асобнай тэмай пасяджэння стала якасць не намінальнага, а рэальнага інклюзіўнага навучання для дзяцей з абмежаванымі магчымасцямі. Наталля Качанава апякуецца дадзенай праблемай. «Гэта нашы дзеці. Пры добрым лячэнні і навучанні яны могуць нармальна працаваць і жыць у соцыуме», — сказала Старшыня Савета Рэспублікі, адзначыўшы, што ў такім пытанні неабходна ўлічваць інтарэсы дзяцей і бацькоў.

На базе Цэнтра карэкцыйна-развіццёвага навучання і рэабілітацыі Полацкага раёна з 2001 года спецыялісты аказваюць раннюю комплексную дапамогу, педагагічнае суправаджэнне ва ўмовах сям'і дзяцей ад нараджэння да трох гадоў. На базе ўстановы працуюць пяць спецыяльных дашкольных груп для дзяцей з цяжкімі і шматлікімі парушэннямі развіцця і 5 класаў.

***(Заканчэнне на 8-й стар.)***

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9



## Бяспека, сацыяльная сфера, прадпрымальніцтва — у цэнтры ўвагі

### У традыцыйным аглядзе расказваем важныя навіны Савета Рэспублікі

• Старшыня Пастаяннай камісіі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Таццяна Рунец узяла ўдзел у панэльнай дыскусіі «Жанчыны — лідары інавацыйных сацыяльных і эканамічных пераўтварэнняў» у рамках Міжнароднага экспартнага форуму «Зроблена ў Расіі». У ходзе дыскусіі ўдзельнікі абмеркавалі ўклад жанчын і павышэнне іх ролі ў працэсах умацавання эканамічнага і культурнага патэнцыялу краін Садружнасці Незалежных Дзяржаў. «Прадпрымальніцкая актыўнасць жанчын — гэта вялізны эканамічны рэсурс. Наша краіна не з'яўляецца выключэннем. У мэтах падтрымкі і ўзмацнення ролі беларускіх жанчын, стымулявання іх дзелавой актыўнасці ў Беларусі зацверджаны Нацыянальны план дзеянняў па забеспячэнні гендарнай роўнасці на найбліжэйшую пяцігодку. Акрамя таго, у нашай краіне распрацаваны ўнікальныя фінансавыя інструменты падтрымкі жанчын. Напрыклад, у «Банку развіцця» і «Белінвестбанку» прадстаўлены спецыяльныя прадукты і шырокі спектр паслуг для падтрымкі жаночага прадпрымальніцтва. Гаворачы аб патэнцыяле нашай краіны ў рамках міжнароднай кааперацыі, хачу адзначыць, што Беларусь зацікаўленая ў дынамічным нарошчванні гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва з усімі ўдзельнікамі СНД», — адзначыла Таццяна Рунец у сваім выступленні. Яна падкрэсліла, што Беларусь гатовая разглядаць рэалізацыю новых праектаў у розных сферах, якія дадуць магчымасць знайсці новыя пункты росту для нарошчвання ўзаемнага тавараабароту і пашырэння супрацоўніцтва краін Садружнасці. Жаночы ўдзел тут адыгрывае важную ролю і садзейнічае дасягненню поспеху ў дадзеным напрамку.

• Старшыня Пастаяннай камісіі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Віктар Лісковіч узяў удзел у 70-м пасяджэнні пастаянна дзеючага пры Парламенцкім сходзе Саюза Беларусі і Расіі семінара па пытаннях будаўніцтва Саюзнай дзяржавы ў Калінінградзе. На парадку дня — ахова здароўя дзяцей, дэмаграфічная палітыка і рэалізацыя праграм актыўнага даўгалецця ў Саюзнай дзяржаве. Па выніках пасяджэння распрацаваны практычныя рэкамендацыі, якія будуць накіраваны ў міністэрствы і ведамствы дзвюх дзяржаў, іншым зацікаўленым. Таксама Віктар Лісковіч паўдзельнічаў у пасяджэнні Камісіі Парламенцкага сходу па працы, сацыяльнай палітыцы і ахове здароўя. Разгледжаны вопыт работы медыцынскіх і санаторна-курортных устаноў Калінінградскай вобласці па лячэнні і аздараўленні грамадзян пасля перанесенай каранавіруснай інфекцыі (COVID-19).

• Старшыня Пастаяннай камісіі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы, член Пастаяннай камісіі Парламенцкай Асамблеі Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы па палітычных пытаннях і міжнародным супрацоўніцтве Сяргей Рачкоў узяў удзел у пасяджэнні Каардынацыйнай нарады старшынь камітэтаў па абароне і бяспецы парламентаў дзяржаў — членаў АДКБ пры Савеце ПА АДКБ. Сяргей Рачкоў адзначыў значную актывізацыю работы парламентарыяў. «Цяперашняя нарада праходзіць у дастаткова няпросты час. Ідзе ўзмацненне прысутнасці НАТА на заходняй граніцы нашай краіны, Беларусь сумесна з Расійскай Федэрацыяй вымушана ўмацоўваць паўднёвую граніцу. Парламентарыі павінны трымаць гэтыя пытанні на кантролі і ўдзельнічаць у распрацоўцы рашэнняў, якія прымаюцца», — падкрэсліў сенатар.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

# ПРАФАРЫЕНТАЦЫЯ, ІНКЛЮЗІЎНАЯ АДУКАЦЫЯ, ЦЭНАЎТВАРЭННЕ

*(Заканчэнне. Пачатак на 7-й стар.)*

У бягучым годзе на суму звыш 17 тысяч рублёў было абноўлена абсталяванне для дзяцей з праблемамі слыху і зроку. З бягучага навучальнага года ў 9-й і 14-й школах горада ўведзены стаўкі цьютараў, але ў гэтым напрамку ёсць шэраг праблем, адна з іх — дэфіцыт педагагічных кадраў. Старшыня Савета Рэспублікі звярнула ўвагу, што ў Полацку ёсць педагагічны і медыцынскі каледжы, якія можна ўключыць у вырашэнне пытання падрыхтоўкі спецыялістаў для работы з дзецьмі з асаблівасцямі развіцця. «Полацк у інклюзіўнай адукацыі можа быць лідарам. Падумайце, можа, у каледжах можна адкрыць новыя спецыяльнасці для падрыхтоўкі прафесіяналаў, якія будуць працаваць з такімі дзецьмі. Тут таксама трэба правесці прафарыентацыйную работу. Займіцеся гэтым пытаннем», — унесла прапанову Наталля Качанава.

## Рабочыя прафесіі — соль зямлі

Што датычыцца маладзёжнай палітыкі, то ў раёне актыўна далучаюць моладзь да патрыятычнага, валанцёрскага руху, грамадскай работы. У снежні мінулага года на базе ваеннай часці 5530 адкрыліся ваенна-патрыятычныя клубы «Рубеж» і «Сокал», для навучэнцаў Полацкага кадэцкага вучылішча ў летні перыяд на базе в/ч 55719 функцыянуе лагер «Гвардзеец». Старажытная Полаччына сёлета стала стартавай пляцоўкай для 11 рэспубліканскіх, 25 абласных і 30 рэгіянальных мерапрыемстваў, патрыятычных аўтапрабегаў і акцый, сярод іх — маладзёжны беларуска-расійскі лагер «Курган-2022», інфармацыйна-асветніцкі праект «Спадчына Полацкай зямлі», рэспубліканскі аўтапрабег «Адзіныя». Важную ролю ў рэалізацыі маладзёжнай палітыкі на Полаччыне адыгрывае Беларуская праваслаўная царква: моладзі расказваюць пра духоўныя асновы грамадства, святых полацкай зямлі, падтрымліваюць традыцыйныя хрысціянскія сямейныя каштоўнасці, з 2012 года пад кіраўніцтвам Полацкай епархіі функцыянуе каардынацыйны цэнтр аховы жыцця і сямейных каштоўнасцяў.

Асобны акцэнт Наталля Качанава зрабіла на рабоце з працоўнай моладдзю: «Мы не павінны страціць гэтыя маладыя кадры пры пераходзе з установы адукацыі на прадпрыемствы. Гэта энергічныя людзі, якія атрымалі пэўны досвед. Яны могуць потым прыходзіць у школы, мець зносіны з дзецьмі, расказваць аб сваёй рабоце і асабістых магчымасцях прадпрыемства. А школьнікі, паслухаўшы іх расказы, зразумеюць, што не трэба нікуды з'язджаць і можна паўнацэнна жыць і працаваць на малой радзіме. У савецкія гады нездарма аддавалася ўвага рабочым прафесіям, час паказаў, што яны — соль зямлі. І з імі таксама трэба працаваць», — падкрэсліла Старшыня Савета Рэспублікі.

***

Падводзячы вынікі пасяджэння, Наталля Іванаўна адзначыла, што за амаль 30 гадоў нашай невялікай гісторыі мы стварылі адну з найлепшых прававых дзяржаў. Кожны жадаючы можа звярнуцца ў Савет Рэспублікі з прапановамі, якія будуць аператыўна разгледжаны. Але існуе і праблема: прыняць пэўны закон можна, а як ён будзе рэалізаваны на месцах — іншае пытанне. «Асаблівае патрабаванне да кіраўніцтва ўстаноў адукацыі: звяртайце пільную ўвагу на кадры. Чалавеку, які не любіць дзяцей, не месца ў педагогіцы, бо ваш уплыў на маладое пакаленне вельмі сур'ёзны. Нам важна даць школьніку каштоўныя веды, але важней — выхаваць яго чалавекам, патрыётам сваёй краіны. Таму да кожнага неабходна падабраць індывідуальны падыход, ахінуць клопатам тых дзяцей, якім гэта неабходна», — сказала Наталля Качанава.

## Аб тым, што хвалюе і цікавіць

На сустрэчы з працоўным калектывам будаўніча-мантажнага трэста № 16 горада Наваполацка былі абмеркаваны пытанні харчовай бяспекі, цэнаўтварэння, змен у выбарчай сістэме, раўнамернага развіцця рэгіёнаў. Старшыня Савета Рэспублікі падкрэсліла, што харчовая бяспека ў Беларусі забяспечана ў поўнай меры, стаўка на аграрны сектар, якую калісьці зрабіў Прэзідэнт, сёння дае высокія вынікі: мы не толькі забяспечаныя ўсім неабходным, але і адпраўляем сваю прадукцыю на экспарт. Сёння пільная ўвага адводзіцца цэнаўтварэнню: маніторынгі, якія праходзяць на гандлёвых аб'ектах, накіраваны на ўраўнаванне цэн незалежна ад рэгіёнаў, бо гэта — адзін з інструментаў харчовай бяспекі краіны. Дарэчы, падчас рабочай камандзіроўкі ў Наваполацк Наталля Іванаўна наведала і гандлёвыя аб'екты горада, вывучыла асартымент і цэны.

Наталля Качанава расказала калектыву будтрэста аб зменах у заканадаўстве краіны, якія датычацца Усебеларускага народнага сходу. Гэтаму інстытуту надалі канстытуцыйны статус. У склад дадзенага органа ўвойдуць выдатныя людзі краіны. Старшыня Савета Рэспублікі растлумачыла, што дэлегаты ва УНС будуць працаваць на працягу пяці гадоў, яго сходы будуць праводзіцца не радзей як адзін раз на год, а яго прэзідыума — не радзей як раз у паўгоддзе. Спікер закранула змяненні ў выбарчым заканадаўстве, падкрэсліўшы, што ў Беларусі 2024 год будзе палітычна актыўным — у лютым у адзіны дзень галасавання пройдуць выбары дэпутатаў усіх узроўняў, а праз 60 дзён павінен быць сфарміраваны склад УНС.

**Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.**

У СВАЁЙ АКРУЗЕ

# «МЫ ЎСЁЙ СЯМ'ЁЙ РАДАВАЛІСЯ ЗА НАШАГА МУЖА І БАЦЬКУ»

## Шчырыя гісторыі, якія расказалі жыхары Гродзеншчыны пасля звароту да сенатара

**КАЖУЦЬ, што чалавек вызначаецца не па словах, а па справах. У гэтым давялося ўпэўніцца пасля размовы з жыхарамі Мастоўскага, Шчучынскага і Ваўкавыскага раёнаў. Менавіта ў гэтых раёнах праводзіць прыёмы грамадзян і прамыя лініі член Пастаяннай камісіі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі Валянцін Байко. На жаль, з самім сенатарам сустрэцца не давялося — цяпер ён знаходзіцца ў камандзіроўцы па справах прадпрыемства «Контэ Спа», заснавальнікам якога з'яўляецца. Затое давялося пагутарыць з тымі жыхарамі, якія звярталіся да сенатара са сваімі праблемамі. І вось што яны расказалі...**



### Праблемы пасля рамонту

Здавалася б, павінна быць наадварот. Праблемы якраз рамонт і павінен вырашыць. Але жыхарка аграгарадка Руткевічы Шчучынскага раёна Ганна Клышэвіч сутыкнулася з яго негатыўнымі наступствамі. А праявіліся яны ў выглядзе вільгаці ў спальні.

Па словах жанчыны, па сцяне і столі пайшоў грыбок, шпалеры, вядома, паадпадалі. Такое суседства мала каму спадабаецца, а для яе, інваліда II групы, хворай на анкалогію, гэта стала яшчэ і асабліва небяспечным для здароўя.

Грамадзянка расказала, што жыве тут больш за 50 гадоў. Праўда, раней з такой праблемай не сутыкалася. А пасля рамонту яшчэ і ў пад'ездзе пачало цячы.

Ганна Людвігаўна, не знайшоўшы паразумення з мясцовымі службамі, звярнулася на прамую лінію да сенатара. У хуткім часе яе наведала жыллёвая камісія. Было ўстаноўлена, што праблема ўзнікла з-за нядобрасумленнага рамонту старога двухпавярховага дома — пасля рамонтных работ стаў працякаць дах, што і прывяло да з'яўлення вільгаці ў кватэры.

Як правіла, такая праблема можа цягнуцца даволі доўга. Яе рашэнне ўзяў на кантроль сенатар Валянцін Байко. У выніку праведзены адпаведныя работы па выдаленні вільгаці ў пакоі. Паверхня апрацавана спецыяльным растворам, адноўлена столь. Пераклеілі шпалеры. Разабраліся і з пад'ездам. Ганна Людвігаўна не хавае сваёй удзячнасці не толькі сенатару, але і выканаўцам. На яе думку, вельмі аператыўна спрацавала кіраўніцтва Шчучынскай ЖКГ. Была выдзелена брыгада для ліквідацыі наступстваў вільгаці. Дзякуе жанчына за падтрымку і старшыні раённага Савета дэпутатаў Ганне Хвядзюк, якая пастаянна тэлефануе і цікавіцца станам спраў. «Сітуацыю трымаюць на кантролі, — заўважае суразмоўніца, — кажуць, каб абавязкова паведаміла, калі будуць праблемы, але пакуль вільгаці няма».

### Пуцёўка ў «Аксакаўшчыну» і каляска з аўтапрыводам

Так здарылася, што ў выніку аварыі Віктар Філіпчык з Мастоў аказаўся ў інвалідным калясцы. Вось ужо амаль 26 гадоў яна з'яўляецца яго галоўным транспартным сродкам. Але каляскі часта выходзілі са строю.

— Мой муж крыху паўнаваты, каляскі ламаюцца, два тыдні — і трэба рамантаваць. А Віктар любіць паездзіць, пагаварыць, ён наогул вельмі кантактны ў мяне, не можа дома сядзець, — расказвае жонка Алена Лявонцеўна. — Вось і да ўлад пастаянна звяртаецца, каб з'езды з тратуараў былі зручныя для каляскі. Яму ідуць насустрач.

Трэба сказаць, што ў гэтай сям'і незвычайны лёс. Ім выпала нямала сур'ёзных выпрабаванняў... Але Філіпчыкі прымалі ўдары лёсу вельмі дружна і стойка.

Пасля аварыі Віктар Віктаравіч доўгі час знаходзіўся ў коме. Ніхто не верыў, што ён будзе жыць, не кажучы пра тое, што ўстане на ногі. Акрамя жонкі.

— Адзін працэнт толькі давалі, і я схапілася за гэты працэнт, — кажа жанчына. — Я яго даглядала, рэфлексы распрацоўвала. Я вельмі верыла, што ён ачуне. Але гэта здарылася толькі праз чатыры месяцы. Дзеці-школьнікі — вучылі яго чытаць, пісаць, хадзіць. Разам рабілі масажы. Выцягнулі яго. Сама два інсульты перанесла пасля таго. Але мне вельмі дапамагалі мае сёстры. Муж таксама імкнецца дапамагаць, хоць і цяжка яму. Асабліва нервуецца, калі ламаецца інвалідная каляска.

У сям'і падумалі і вырашылі звярнуцца да Валянціна Байко. Віктар Віктаравіч патэлефанаваў сенатару падчас прамой лініі з просьбай дапамагчы набыць трывалую і зручную каляску. Сенатар не толькі ажыццявіў гэту мару, але і сам прыехаў, каб уручыць падарунак заяўніку.

— Мы ўсёй сям'ёй радаваліся за нашага бацьку і мужа, — расказвае Алена Філіпчык. — Каляска яму вельмі дапамагла. Раней часта прыходзілася нешта рамантаваць, муж прасіў хлопцаў зрабіць зварку дэталяў. Новая каляска трывалая, з электрапрыводам. Нам самім складана такую набыць, бо каштуе нятанна — больш за тры тысячы рублёў. Вельмі ўдзячны Валянціну Валянцінавічу.

Удзячныя словы адрасуе сенатару і жыхар вёскі Вялікая Рагозніца Мастоўскага раёна Канстанцін Дзямідзік. Пасля звароту на прамую лінію інваліду І групы аказана дапамога ў рэабілітацыі ў Рэспубліканскай клінічнай бальніцы медыцынскай рэабілітацыі «Аксакаўшчына».

— Я сёлета ездзіў лячыцца ў «Аксакаўшчыну». Такая рэабілітацыя дапамагае мне заставацца на нагах. Мой урач, якая мяне і раней лячыла, сказала, што ёсць станоўчая дынаміка. Мне хочацца вярнуцца да работы.

Канстанціну Браніслававічу — 55 гадоў, больш за 20 з іх ён працаваў механізатарам у мясцовай гаспадарцы. Яшчэ з 12 гадоў дапамагаў на жніве, быў памочнікам камбайнера. А ў той час абавязкаў было значна больш, бо тэхніка была не такая дасканалая, як цяпер. Інваліднасць атрымаў пасля двух інсультаў. Кажа, што лячэнне і рэабілітацыя значна паляпшаюць стан здароўя. Асабліва яму спадабалася ў Рэспубліканскай бальніцы медыцынскай рэабілітацыі, куды яму была аплачана пуцёўка коштам 4200 рублёў.

Памочнік сенатара Алена Івановіч паведаміла, што Валянцін Байко шмат дапамагае сваім выбаршчыкам у медыцынскім кірунку. Так, Івану Казлоўскаму з Мастоў пасадзейнічаў ва ўстанаўленні групы інваліднасці. З дапамогай сенатара закуплены тры дарагія апараты для вентыляцыі лёгкіх у медыцынскія ўстановы.

### Будуць з цяплом

Летась у Тацццяны Гайко з вёскі Раднікі Ваўкавыскага раёна паўстала паліўная праблема. Яшчэ задоўга да халадоў яна стала ў чаргу на брыкет на мясцовым паліўным прадпрыемстве. Чакаць давялося некалькі месяцаў. Ужо і халады падышлі, а брыкет усё не вязуць. Калі Тацццяна Яўгенаўна звярнулася на прадпрыемства, там растлумачылі, што Ваўкавыскаму філіялу не выдзяляецца паліва ў поўным аб'ёме. Аб гэтым яна паведаміла сенатару падчас прамой лініі, якая праходзіла ў снежні мінулага года. Рэакцыя на званок аказалася проста маланкавай.

— Не паспела патэлефанаваць, а мне ўжо вязуць брыкет. Вось што значыць дайсці да сенатара. Так што працуюць добра. Званкі прымаюць і выконваюць пажаданні. Калі хто скардзіцца, іх стараюцца задаволіць. Я больш не скардзілася, у мяне ўсё ёсць.

Сёлета жанчыне нават заказваць брыкет не прыйшлося. Тры з паловай тоны паліва прывезлі задоўга да халадоў. Задаволілі патрэбу ў ім і іншых вяскоўцаў.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**
**Фота дадзена памочнікам сенатара.**

# ПЫТАННЕ ДЗЯРЖАЎНАЙ ВАЖНАСЦІ

## Юрый Наркевіч правёў прыём грамадзян і маніторынг цэн у Бярозаўскім раёне

**НА мінулым тыдні член Савета Рэспублікі Юрый НАРКЕВІЧ выбраў для наведвання аграгарадок Малеч Бярозаўскага раёна. Гэта даволі вялікі населены пункт — тут пражывае больш за 1600 чалавек. У савецкія часы Малеч славіўся сваёй аграфірмай, а таксама развітой інфраструктурай. Таму не дзіва, што населены пункт стаў у свой час першым аграгарадком у раёне.**



Работа сенатара ў акрузе пачалася з прыёму грамадзян. Наведвальніца з Белаазёрска папрасіла паспрыяць з працаўладкаваннем. Жанчына па прафесіі медсястра. І ёй адразу падчас прыёму працанавалі на выбар тры вакансіі, праўда, у райцэнтры. Медработнік падумала і прыняла прапанову, вырашыўшы, што ездзіць на работу ў горад за 25 кіламетраў не будзе праблемай, людзі дабіраюцца і далей.

Другая заяўніца скардзілася на стан дарогі каля яе дома па адной з вуліц Малечы. У дажджлівае надвор'е там становіцца цяжка прайсці. Праз старшыню раённага Савета Дануту Гукіну, якая прысутнічала на прыёме, даручэнне атрымала кіраўніцтва ДРБУ, што абслугоўвае дарогу. А шматдзетная маці з аграгарадка Падкраічы прыйшла дэлегатам ад групы аднавяскоўцаў. У іх па вуліцы ходзіць магутная тэхніка сельгаспрадпрыемства, машыны і трактары перыядычна разбіваюць дарогу, летам дабаўляецца пыл, які літаральна забівае вокны. Праблема вырашаецца не так проста: каб пусціць тэхніку ў аб'езд, магчыма, спатрэбіцца сродкі, пэўная арганізацыйная работа. Вывучыць пытанне і даць грунтоўны адказ жыхарам вёскі ўзяўся першы намеснік старшыні Бярозаўскага райвыканкама Міхаіл Крэйдзіч.

Маніторынг цэн і асартыменту сенатар пачаў з магазіна буйной гандлёвай сеткі. Як заўважыла памочнік сенатара Разалія Карпеш, гандаль у Малечы прадстаўлены прадпрыемствамі розных формаў уласнасці. Паміж магазінамі існуе здаровая канкурэнцыя. Таму пра асартымент, культуру абслугоўвання як формы барацьбы за пакупніка крамы нязменна клапоцяцца. Сведчанне таму — магазін «Капеечка» сталічнай гандлёвай сеткі. Пакупнікі, з якімі пагаварылі прадстаўнікі маніторынгавай групы, адзначылі рост цэн на працягу года, але за час з 5 кастрычніка цэны не ўзнімаліся. А пенсіянеры рэгулярна глядзяць тэлевізар, таму вельмі ўважліва вывучалі цэннікі і ніякага павелічэння не заўважылі. Да іх аўтарытэтнага меркавання не было нагоды не прыслухацца сенатару.

Дырэктар магазіна Іна Дрозд заўважыла, што тавар ім паступае з Мінска, там жа фарміруюцца і цэны. Яны тут, у Малечы, не могуць самастойна ўзняць альбо панізіць кошт тавару. Паводле слоў дырэктара, пачынаючы з пятага числа цэны ў іх не мяняліся ні на капейку.

Зайшоў сенатар і ў суседнюю краму. Там парадавала разнастайнасць тавараў. Малочную і мясную прадукцыю прапануюць вялі ад некалькіх вытворцаў на выбар. Як заўважылі пакупнікі, цэны на малочную прадукцыю «Савушкінага прадукту» нават знізіліся на некалькі капеек за апошнія два тыдні.

— За цэнамі сачу як пакупнік, як старшыня абласнога Савета дэпутатаў, як сенатар. Гэта пытанне дзяржаўнай важнасці. З цэнамі нікому не дазволена «гуляць». Устаноўлены парадак, па якім будуць фарміравацца цэны, і гэты парадак будзе захоўвацца, — падсумаваў Юрый Наркевіч вынікі свайго маніторынгу.

Зазірнула ў той дзень маніторынгавая група і ў аптэку. Аптэка РУП «Фармацыя» ў Малечы мае як айчынныя, так і замежныя прэпараты. Фармацэўт Іна Бандарэнка паведаміла, што ў вёсцы пацыенты могуць атрымаць любы прэпарат, прызначаны дакторам: «Калі ў нас няма лякарства, мы хутка звязваемся з Брэстам і заказваем». А наведвальнікі адзначылі, што некаторыя лекі ў іх можна купіць нават танней, чым у горадзе.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
**Фота Аляксандра ТЫМАНСКАГА.**

# ЦЭНЫ Ў КРАМАХ ЗАМАРОЗІЛІ

## Сенатар Алена Зяблікава наведала гандлёвы пункт «Веста-Барысаў», пагутарыла з прадаўцамі і пакупнікамі

**У Барысаўскім раёне працягваецца маніторынг цэн. Днямі член Савета Рэспублікі Алена ЗЯБЛІКАВА разам з прадстаўнікамі Мінскага абласнога аб'яднання прафсаюзаў наведала гандлёвы дом адкрытага акцыянернага таварыства «Веста-Барысаў». У дадзенае аб'яднанне ўваходзіць звыш сарака гандлёвых аб'ектаў, якія знаходзяцца ў крокавай даступнасці і карыстаюцца папулярнасцю ў жыхароў горада. Сапраўды, сюды можна заскочыць па дарозе з работы і набыць неабходныя прадукты, паколькі тут заўсёды шырокі выбар прадукцыі — як харчовай, так і прамысловай.**



Фота sb.by

«Кантралёры» звярталі ўвагу не толькі на асартымент, але і звяралі цэннікі на тавары з коштам, які выбіваецца па штрых-кодзе. Калі цэннік быў устаноўлены пасля 5 кастрычніка, даныя звяралі з накладнымі.

Камісія наведала практычна ўсе прадуктовыя секцыі, пагутарыла з пакупнікамі. Так, Алена Зяблікава пацікавілася ў адной з пакупніц думкамі наконт асартыменту малочных прадуктаў.

— Мне падабаецца прадукцыя пад нашай барысаўскай гандлёвай маркай, выбар «малочкі» дастатковы, не прыкмеціла, што цэны павысіліся. Мне здаецца, яны засталіся ранейшымі, — такі быў адказ.

Іншая жанчына закапочаная, што раней было малако малой тлустасці. А цяпер прапануюваюць 3,2, 3,4, 3,6-працэнтнай тлустасці. У той жа час асартымент стаў больш разнастайны. Кожны можа выбраць малако па сваім кашальку.

— Вы заўважаеце, што з 5 кастрычніка цэны не павышаюцца. Яны павінны быць замарожаны, каб у далейшым выпрацаваць цанавую палітыку, — канстатавала сенатар.

— Сапраўды так. Не бачу, каб яны рушылі ўверх. Я практычна кожны дзень хаджу ў «Весту» і бачу гэта на свае вочы. Акрамя таго, тут вельмі ўважлівы персанал. Заўсёды параяць, што выбраць. Падабаецца і тое, як выкладзены тавары — прыгожа, акуратна.

Шырока прадстаўлена і лінейка барысаўскай прадукцыі — мукі, хлебабулачных, мясных вырабаў. Стаіць задача, каб паліцы магазінаў напаўняліся прадукцыяй буйных мясцовых прадпрыемстваў. Гэта будзе ўплываць на цэны, бо ў цэнаўтварэнні не апошняе месца займае лагістыка.

— У «Весце» добрая раскладка тавараў, вырабы айчыннай вытворчасці займаюць самыя прыметныя месцы. Мы за гэтым сочым, — дадала Алена Алегаўна. — Радуе і тое, што ў крамах згаданай сеткі не назіраецца пратэрмінаванай прадукцыі.

Помніцца, яшчэ нядаўна пакупнікі змяталі з паліц цукар. У «Весце» гэты салодкі прадукт прадстаўлены рознымі прадпрыемствамі, ёсць рафінад, трысняговы цукар. На паліцах шмат і солі, якую не так даўно куплялі мяшкамі. Соль рознай цанавой катэгорыі, самая танная — па 28 капеек за ўпакоўку.

На паліцах — шырокі асартымент круп, у тым ліку рысу, грэчкі ад розных вытворцаў. Людзі спакойна падыходзяць, бяруць па кілаграму, ажыятажу няма.

— Радуе, што беларускія вытворцы сталі рабіць добрую расфасоўку. Мне, як спажыўцу, падабаецца, што сталі выпускаць разнастайныя крупяныя шматкі — аўсяныя, грачаныя, кукурузныя для правільнага і рацыянальнага харчавання занятых людзей, — дзеліцца сенатар.

Алей таксама на розны густ і кашалёк, у тым ліку і айчынны, рапсавы. Апошні, дарэчы, вельмі карысны для спажывання.

Карыстаецца попытам і дзіцячае харчаванне. Маці разумеюць, што вытворца робіць прадукт высокай якасці. Вядома, што ў некаторых малых алергія, а ў Беларусі самая пільная ўвага да гэтага віду харчавання, высокія стандарты. Таму бацькі ахвотна бяруць кашы, фруктовыя, мясныя кансервы, сокі. І цана на іх даволі прымальная. Дзеці — наша будучыня, на іх нельга нажывацца.

Яшчэ нядаўна кошт курыных яек набліжаўся да 4 рублёў за дзясятак. Цяпер гэты каштоўны прадукт стаў у раёне 3 рублёў. Няма дэфіцыту і з курыным мясам — цэлыя тушкі, кумпяк, крылы, грудзінка, філе.

У кулінарыі можна набыць паўфабрыкаты — галубцы, катлеты, адбіўныя, піханую пальцам каўбасу, шашлыкі, мяса ў марынадзе ўласнай вытворчасці. Вельмі зручна для гаспадынь — не трэба стаяць пасля рабочага дня за плітой. Кінула на патэльню далікатэс — і хутка вячэра гатовая.

Загадчыца харчовага комплексу гандлёвага дома ААТ «Веста-Барысаў» Святлана Мароз расказала, што гандлёвы аб'ект працуе з беларускімі пастаўшчыкамі, тавар паступае без перабояў.

Дадам, што праводзіцца таксама і маніторынг прамысловых тавараў, мыйных сродкаў, лекаў у аптэчнай сетцы, паслуг медыцынскіх устаноў — МРТ, КТ, УГД.

— Спажыўцы павінны разумець, што цэны пад строгім кантролем. Гэта яшчэ раз даказвае, што наша дзяржава клапоціцца пра чалавека, у нас няма месца карупцыйным схемам, усё адкрыта, празрыста для людзей з захаваннем айчыннага заканадаўства. У нас сфарміравана таксама група з 13 чалавек прафсаюзных актывістаў. Гэта людзі розных прафесій, узростаў. Штодзень яны наведваюць па два магазіны, адсочваюць цэны. Вынікі маніторынгу акумулююцца ў райвыканкаме, аддзеле гандлю, — падкрэсліла Алена Зяблікава.

— Мы маніторым аб'екты ў кожным рэгіёне Мінскай вобласці, нашы прадстаўнікі ўваходзяць у рабочыя групы, якія створаны ў кожным раёне, падключаны да работы прафсаюзны актыў. Праманіторана больш як паўтары тысячы гандлёвых аб'ектаў, — падкрэсліў намеснік старшыні Мінскага абласнога аб'яднання прафсаюзаў Дзмітрый Бачкоў. — У гэтай справе ўзаемадзейнічаем з райвыканкамамі, Камітэтам дзяржкантролю.

— Дзмітрый Уладзіміравіч, а ці шмат парушэнняў выяўляеце? — пацікавілася ў свайго суразмоўніка.

— Сістэмных парушэнняў няма. Яны адзінкавыя, не ўплываюць на агульную сістэму. Калі выяўляюцца такія выпадкі, то ім даецца ацэнка, ставіцца задача па выпраўленні становішча. Наша мэта — справядліва, паказаць вытворцу, як фарміруецца цана, каб ён разумеў, як узаемадзейнічаць з гандлёвымі сеткамі і наадварот.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

СПРЭЧНАЕ ПЫТАННЕ

# КАМУ ПАТРЭБНАЯ ДАРОГА Ў ЛЕСЕ?

## Карэспандэнт «МС» паназірала за тым, як разглядаецца зварот ад жыхаркі Магілёўскага раёна

**ЖЫХАРКА вёскі Альхоўка Магілёўскага раёна звярнулася ў Савет Рэспублікі па садзейнічанне ў будаўніцтве дарогі ад яе вёскі да чыгуначнага прыпынку «Новая Ніва». Прычым робіць гэта яна не ўпершыню. Зварот ужо быў разгледжаны магілёўскімі рай- і аблвыканкамамі. Мясцовая ўлада тлумачыць грамадзянцы, што ўчастак дарогі, пра які яна вядзе гаворку, стыхійны і не адносіцца да дарог агульнага карыстання. А да чыгуначнага прыпынку трэба ехаць па пад'язной дарозе да садаводчага таварыства «Новая Ніва» і далей па дарогах таварыства. Але жыхарку такі адказ не задаволіў. Яна зноў звярнулася ў Савет Рэспублікі з той жа праблемай. Жанчына папрасіла разгледзець яе скаргу «з улікам інтарэсаў насельніцтва» з выездам на месца і ўдзелам прадстаўнікоў мясцовых органаў улады, парламента і жыхароў.**

І мы едзем. У разглядзе звароту ўдзельнічаюць **намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Савета Рэспублікі Алег ДЗЯЧЭНКА, старшыня Маладзёжнага парламента Магілёўскага раёна Андрэй ТРЭЙ, намеснік старшыні Магілёўскага райвыканкама Віталь СТАРЧАНКА, старшыня Магілёўскага райсавета дэпутатаў Сяргей ЯРОШЧАНКА, старшыня Семукацкага сельскага Савета Тамара УКРУЖСКАЯ, інжынер ДРБУ-128 Дзмітрый БІРУКОЎ, прадстаўнік Дасовіцкага лясніцтва Мікалай НАВАЛЬНЕЎ.**

Участак дарогі, пра які згадвае жыхарка, праходзіць праз глухі лес. Працягласць яго каля 220 метраў. Праехаць там на машыне немагчыма. Таму рушым па ўказаным маршруце пешшу. Надвор'е сухое, нават сонечнае, але лясная дарога залітая вадой. Яна стаіць у глыбокіх каляінах, пакінутых ад вялікагрузных машын. Ёсць наогул вельмі забалочаныя месцы. Там зроблены драўляныя насцілы, па іх без гумавых ботаў немагчыма было б прайсці. Цяжка ўявіць тут цывільную дарогу, бо падобных, стыхійных, у лесе колькі заўгодна. Зразумела, калі б гэта быў адзіны шлях, які звязвае вёску з «вялікай зямлёй». Але ёсць іншыя. Спецыялісты кажуць, што за паўкіламетра адсюль ёсць добрая гравійная дарога. А гэта, маўляў, унутранага карыстання, па ёй лес вывозілі.

— Гэта і не дарога, і не вуліца, — кажа намеснік старшыні Магілёўскага райвыканкама Віталь Старчанка. — Яе і дарогай назваць можна толькі ўмоўна, бо яе, па сутнасці, няма. Гэта будзе лічыцца ўжо як новае будаўніцтва. Уяўляеце, у якую суму яно абыдзецца? І гэта пры тым, што да чыгуначнага прыпынку можна дабрацца ў абход праз садаводчае таварыства.

Старшыня Семукацкага сельсавета Тамара Укружская ўслых прыкідвае, колькі чалавек рэальна карыстаецца лясной дарогай. Па яе падліках, з пастаянных — два: сама заяўніца і яшчэ адна дачніца. Яна лічыць, што жанчына магла б дабірацца да Магілёва і праз Семукачы.

— Які сэнс у гэтай дарозе? — не разумее яна. — Наогул на якой падставе мы будзем будаваць дарогу ў лесе? І з асвятленнем атрымліваецца няўзгодненасць. Мы што, павінны будзем і правады праз лес цягнуць? А ў пажаранебяспечны перыяд леснікі могуць яшчэ і аштрафаваць за незаконнае знаходжанне ў лесе.

— Тут няма дарогі, — цалкам згодны са старшынёй сельсавета інжынер ДРБУ-128 Дзмітрый Бірукоў. — Гэта ведамства наогул ляснічых. Тут ёсць напрамак, і не больш за тое. Гэта тая сцяжынка, па якой мы ідзём, абыходзячы лужыны ды раўкі. Каб пабудаваць тут дарогу, патрэбныя праектна-каштарысная дакументацыя, даследаванні грунту. Да таго ж землі лясфонду адчужаюцца толькі па рашэнні Прэзідэнта.

— Тут наогул небяспечна хадзіць, — лічыць сенатар Алег Дзячэнка. — Раптоўна чалавеку стане дрэнна, упадзе ў каляіну — і хто яго тут знойдзе. Асабліва калі пенсіянеру за 70.

Дарэчы, заяўніца просіць зрабіць лясную дарогу зручнай не толькі для праходу пешшу, але і для праезду спецтранспарту, той жа хуткай дапамогі. У якасці аргумента яна прыкладае фрагмент нейкай карты, дзе праз дадзены ўчастак сапраўды праходзіць дарога.



Маўляў, бачыце, дарога была, таму прыводзьце яе ў нармальны стан. На жаль, удакладніць, што за карта, немагчыма, бо гэта толькі частка з канкрэтным участкам. Спецыялісты мяркуюць, што гэта нейкая турысцкая схема, дзе магчымы вольныя адступленні. Прадстаўнік Дасовіцкага лясніцтва ўважліва вывучае малюнак.

— На справе перад намі — адзіная квартальная прасека, а што за дарога на карце, я не магу зразумець, — кажа ён. — На нашых картах усе дарогі пазначаны, а гэтай няма.

Вывучаем іншыя лясныя дарогі. Усе яны належаць садаводчаму таварыству «Новая Ніва». Відаць, што на іх падтрымліваецца парадак. Тамара Укружская кажа, што сама зацікаўлена, каб насельніцтву жылося лягчэй. У свой час да Альхоўкі не было нават і праезда, але старшыня сельсавета паклапацілася, каб яго зрабілі, бо бачыла, што гэта рэальна важна і неабходна. Што датычыцца лясной дарогі, то тут яна перакананая, што заяўніца ідзе на прынцып і не лічыцца з тым, наколькі гэта затратна і бесперспектыўна.

— Жанчына прынесла на прыём грамадзян фота лясной дарогі з гэтымі жахлівымі каляінамі, — кажа Тамара Укружская. — Вядома, якая была рэакцыя. У нас спыталіся: «Гэта што, у вас людзі так па вёсцы ходзяць?» Ніхто ж не ведае, што яны гэта ў лесе наздымалі.





Старшыня Магілёўскага райсавета Сяргей Ярошчанка падтрымлівае калегу, кажа, што па ініцыятыве Тамары Укружскай на тэрыторыі сельсавета зроблена 28 кіламетраў дарог. Яна сама першая ж дабіваецца, калі бачыць, што іх трэба рабіць.

— Рамантавалі нават такія дарогі, якія раней былі непраязнымі, а часам закінутыя, — кажа ён. — Але яны былі сапраўды патрэбныя. Штомесячна ў кожным нашым сельвыканкаме праводзяцца Дні Саветаў, на іх узнімаюцца розныя пытанні, якія датычацца і дарог, і якасці вады, і калодзежаў, і аўталавак. Што магчыма зрабіць і мэтазгодна, усё вырашаецца.

А што датычыцца лясной дарогі, будаваць яе дзеля двух-трох чалавек няма сэнсу. Толькі вялікія выдаткі панясём. Праз некаторы час гэтая дарога наогул будзе незапатрабаваная.

У вёсцы Альхоўка сустракаемся з самой заяўніцай. У размове ўдзельнічаюць таксама яе дачка, якая прыехала з Магілёва, і сусед.

— Дарога нам патрэбная, — кажа жанчына. — Да мяне звяртаюцца дачнікі, і я агучваю і іх просьбы. Калі трэба, усе яны падпішуцца за гэтую дарогу. Жыхары вёсак Коркаць, Пушча, Альхоўка ўвесь час ёю карысталіся. Усе ходзяць сюды. Цяпер людзей мала, але летам дачнікі прыязджаюць разам з дзецьмі.

— Мы ўсё жыццё па гэтай дарозе хадзілі, — падключаецца дачка заяўніцы. — У нас адна дарога на станцыю. Іншых няма. Раней па гэтай дарозе і машыны ездзілі, і трактары.

Жанчыны лічаць, што іх дарога вялікіх укладанняў не патрабуе. Маўляў, там усяго дзве нізінкі, дзе вада стаіць. Трубу паклаў, насып зрабіў — і ўсё. Але ўлады глядзяць на праблему па-іншаму.

— Любое рашэнне павінна быць эканамічна ўзважана, — кажа намеснік старшыні Магілёўскага райвыканкама Віталь Старчанка. — Уладкаванне новай дарогі — гэта вялікія выдаткі і тэрміны. Каб дарога служыла, трэба будзе ўкласці вялікія сродкі. Ці апраўдаецца тое? Крыніц фінансавання такога аб'екта ў раёне на дадзены момант няма. У Магілёўскім раёне пражывае вялікая колькасць насельніцтва. Зваротаў бывае шмат. Людзей цікавяць розныя пытанні, мы выязджаем, глядзім, калі зварот абгрунтаваны, вырашаем праблему. А гэты зварот патрабуе вялікіх фінансавых сродкаў. Пры гэтым яго мэтазгоднасць пад сумненнем.

— Калі ў кагосьці ёсць жаданне ісці па сцяжынцы праз лес, ніхто не супраць, — рэзюмуе сенатар. — Але чалавек патрабуе дарогу там, дзе знаходзіцца квартальная прасека. Трэба глядзець на рэчы рэальна. Хто будзе карыстацца гэтай дарогай? У Альхоўцы зарэгістраваны тры чалавекі, у Коркаці — 13, у Новай Ніве — 12, у Пушчы — 9 чалавек. Але яшчэ не факт, што яны ходзяць менавіта гэтай дарогай. Па-першае, вялікія адлегласці (ад той жа Коркаці да Альхоўкі — пяць кіламетраў), па-другое, ёсць альтэрнатыўныя шляхі вырашэння пытання.

Па запытах жыхароў у Коркаць, напрыклад, ходзіць маршрутка.

Між тым заяўніца настойвае на сваім.

— На Астраўшчыну зрабілі дарогу, а там зімой людзі нават і не жывуць, — кажа яна. — Але яны сталі дабівацца, пісалі ў Мінск, і ім зрабілі. Мы таксама дабіваемся ўжо з 2010 года. Але нічога не робіцца. Значыць, калектыўны зварот напішам і кожны падпішацца.

Зварот жыхаркі вёскі Альхоўка пакуль у рабоце. У азначаны заканадаўствам тэрмін па ім будзе дадзены абгрунтаваны адказ.

**Нэлі ЗІГУЛЯ,**
**фота аўтара.**
*Магілёўскі раён.*

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

**Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»**

**Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.**

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by

**(для зваротаў):** zvarot@zviazda.by

**АДРАС РЭДАКЦЫІ:**
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.
**КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН** 311 17 35;
**e-mail:** info@zviazda.by
**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1.**

**Тыраж 14.804. Нумар падпісаны ў 19.30 25 кастрычніка 2022 года.**

## РУП «Институт недвижимости и оценки» (Гродненский филиал)

**информирует о проведении открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Лида-агротехсервис»**

**Аукцион состоится 25.11.2022 г. в 11.00 по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209. Телефон для справок 55-87-71**

| **Лот № 1** | |
|---|---|
| **Наименование, характеристика предмета аукциона, местонахождение предмета аукциона** | ЛОТ 1:<br>- капитальное строение, инв. № 420/С-42745 (назначение – здание административно-хозяйственное, наименование – проходная), общей площадью 48,2 кв. м, расположенное по адресу: г. Лида, ул. Дзержинского, д. 73, корп. 1;<br>- капитальное строение, инв. № 420/С-4534 (назначение – здание административно-хозяйственное, наименование – здание конторы), обшей площадью 204,7 кв. м, расположенное по адресу: г. Лида, ул. Дзержинского, д. 73;<br>- капитальное строение, инв. № 420/С-100411 (назначение – сооружение неустановленного назначения, наименование – сооружение благоустройства), обшей площадью 13678 кв. м, расположенное по адресу: г. Лида, ул. Дзержинского, д. 73, сооружение благоустройства;<br>- капитальное строение, инв. № 420/С-4533 (назначение – здание специализированное иного назначения, наименование – душевая), общей площадью 46 кв. м, расположенное по адресу: г. Лида, ул. Дзержинского, д. 73;<br>- оборудование: кран козловой КК 10-25, 1976 г. в.; кран козловой КС-12,5/20, 1985 г. в.; котел газовый напольный K45-8E23 Supraline, 2011 г. в.; комплектная трансформаторная подстанция (КТП) № 137, 1993 г. в.<br>Лот № 1 расположен на земельном участке, кадастровый № 441300000011000280, площадью 2,5117 га (назначение – для обслуживания производственной территории), расположенном по адресу: г. Лида, ул. Дзержинского, 73. Земельный участок является неделимым и на данном земельном участке расположены иные объекты, не подлежащие продаже. Оформление земельного участка будет производится после приобретения объекта в порядке, предусмотренном законодательством Республики Беларусь |
| **Начальная цена продажи** | 493 320 руб. (четыреста девяносто три тысячи триста двадцать рублей) с учетом НДС |
| **Сумма задатка** | 49 332 руб. (сорок девять тысяч триста тридцать два рубля) |
| **Реквизиты для перечисления задатка** | BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225 |
| **Место, дата и время окончания приема заявлений** | Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 208, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед с 12.30 до 13.18.<br>Последний день приема заявлений – **23 ноября 2022 г. до 15.00** |

Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, а также определения лица, выигравшего аукцион, содержатся в информации о проведении аукциона, опубликованной на сайте Организатора аукциона – https://grino.by/auktsiony

## РУП «Институт недвижимости и оценки» (Гродненский филиал)

**информирует о проведении открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего Гродненскому областному потребительскому обществу**

**Аукцион состоится 09.11.2022 г. в 11.00 по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209. Телефон для справок 55-87-71**

| **Лот № 1** | |
|---|---|
| **Наименование, характеристика предмета аукциона, местонахождение предмета аукциона** | Лот № 1<br>- капитальное строение с инвентарным номерам 431/С-38819 (целевое назначение – здание специализированное складов торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – здание склада, площадью 1092,4 кв. м, расположено по адресу: Гродненская обл., г. п. Кореличи, ул. Красноармейская, 44А;<br>- капитальное строение с принадлежностями с инвентарным номерам 431/С-38820 (целевое назначение – здание специализированное для обработки древесины и производства изделий из дерева, включая мебель, наименование – здание столярного цеха площадью 138,1 кв. м;<br>- ограждения, забор железобетонный протяженностью 386 метров расположено по адресу: Гродненская обл., г. п. Кореличи, ул. Красноармейская, 44А/1.<br>Лот № 1 расположен на земельном участке, кадастровый номер 423355100001000233, площадью 1,7478 га (назначение – земельный участок для размещения объектов иного назначения) по адресу: г. п. Кореличи, ул. Красноармейская, 44А. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: земли, находящиеся в охранных зонах линий электропередачи, код – 6, площадью 0,0800 га |
| **Начальная цена продажи** | 69 217,79 руб. (шестьдесят девять тысяч двести семнадцать рублей семьдесят девять копеек) с учетом НДС |
| **Сумма задатка** | 6 921 руб. (шесть тысяч девятьсот двадцать одни рубль) |
| **Реквизиты для перечисления задатка** | BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225 |
| **Место, дата и время окончания приема заявлений** | Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 208, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед с 12.30 до 13.18.<br>Последний день приема заявлений – **04 ноября 2022 г. до 15.00** |

Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, а также определения лица, выигравшего аукцион, содержатся в информации о проведении аукциона, опубликованной на сайте Организатора аукциона – https://grino.by/auktsiony

## Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**Лот: капитальное строение с инвентарным номером 100/С-51916 (наименование: кафе «Весна»; назначение: здание специализированное для общественного питания), площадью 627,1 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Брестский р-н, Клейниковский с/с, аг. Клейники, ул. Центральная, 17/1, на земельном участке с кадастровым номером 121281204601000607, площадью 0,3114 га, составные части и принадлежности: подвал**

| Начальная цена, руб. (без учета НДС) | 300 000,00 | Размер задатка, руб. | 30 000,00 |
|---|---|---|---|

**Продавец:** ОАО «Селекционно-гибридный центр «Западный», Брестская обл., Брестский р-н, аг. Б. Мотыкалы, 80162918159, тел./факс 80162918159. **Организатор торгов:** Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Брест, ул. Наганова, 10-329, тел./факс 80162408701. Задаток вносится на расчетный счет Организатора аукциона до подачи заявления. **Р/сч для перечисления задатка:** р/с BY32BAPB30127866600100000000, в ОАО «Белагропромбанк» ЦБУ № 116 в г. Брест, РД по Брестской области, код банка BAPBBY2X, УНП 201028245. **Условия продажи:** без условий. **Срок заключения договора купли-продажи:** не позднее 5 рабочих дней со дня проведения аукциона. **Условия оплаты:** согласно заключенному договору купли-продажи в течение 2 месяцев с даты заключения договора купли-продажи. **Информация о возмещении затрат:** участник аукциона, выигравший торги, оплачивает Продавцу НДС в размере 20 % от стоимости продажи объекта, а также в течение 3 рабочих дней со дня аукциона возмещает фактические затраты на организацию и проведение аукциона, включающие вознаграждение Организатора аукциона. **Срок возможного отказа от проведения аукциона:** не позднее чем за 3 календарных дня до наступления даты проведения аукциона

**Аукцион состоится 01 декабря 2022 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325**

Сведения о документах, которые необходимо предоставить для участия в аукционе, порядок, в соответствии с которым проводится аукцион, а также иная информация содержатся на сайте Организатора аукциона **www.ocenkabrest.by**, а также можно узнать по телефонам: **8 (0162) 40-87-01, 40-87-02**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00**

**Последний день приема заявлений – 30 ноября 2022 г. до 17.00**

***ООО «Центр Белинвентаризация»***
*г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2-1*

- ✓ **Оценка и переоценка всех видов имущества**
- ✓ **Раздел и установление порядка пользования земельным участком**
- ✓ **Раздел и вычленение изолированных помещений из капитального строения**
- ✓ **Разработка бизнес-планов, ТЭО**

## ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА ЖИТКОВИЧСКОГО ФИЛИАЛА ГОМЕЛЬСКОГО ОБЛАСТНОГО ПОТРЕБИТЕЛЬСКОГО ОБЩЕСТВА, тел. 8 (02353) 2 22 78

| № лота | Наименование объекта | Начальная стоимость лота, бел. руб. с НДС | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | **Капитальное строение (здание хлебозавода) с инв. № 332/С-75125, площадью 1275,6 кв. м (составные части и принадлежности: две пристройки, две террасы, площадка), расположенное по адресу: Гомельская обл., Житковичский р-н, г. Житковичи, ул. Фрунзе, 83.**<br>Объект расположен на земельном участке с кадастровым номером 321650100003009144 площадью 0,3106 га | **175 000,00 руб.** | **17 500,00 руб.** |

| | |
|---|---|
| **Срок подачи заявления** | **По 24 ноября 2022 г.** в рабочие дни с 9.00 до 16.00 от даты опубликования настоящего извещения по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2-1 |
| **Дата, время и место проведения аукциона** | **25 ноября 2022 г. в 11.00** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2-1 |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | Р/с BY71BPSB30121783390109330000 в РД № 300 ОАО «Сбербанк», БИК BPSBBY2X, УНП 491323266.<br>Получатель платежа: ООО «Центр Белинвентаризация».<br>Назначение платежа: задаток на участие в аукционе согласно извещению в газете «Звязда» от 26.10.2022 г. |
| **Условия продажи** | Шаг аукционных торгов – 5 %. Заключить договор купли-продажи в течение 14 (четырнадцати) календарных дней после подписания протокола о результатах аукциона. Стоимость лота, сформированная на аукционе, должна быть выплачена Победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) Продавцу в течение 3 (трех) рабочих дней с момента подписания договора купли-продажи. Победитель возмещает затраты на организацию и проведение аукциона |

**Для участия в аукционе необходимо представить:**

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме и подписанное соглашение о правах и обязанностях с ООО «Центр Белинвентаризация».
2. Заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка на расчетный счет организатора торгов.
3. Юридическим лицам – резидентам Республики Беларусь – копию документа, подтверждающего регистрацию юридического лица; представителю юридического лица – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица).
4. Юридическим лицам – нерезидентам Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе); представителю юридического лица – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица).
5. Индивидуальным предпринимателям – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию; представителю индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица).
6. Физическим лицам – представителю физического лица – доверенность (документ, подтверждающий полномочия лица) и документ, удостоверяющий личность данного представителя.
7. При подаче документов на участие в аукционе физические лица, представители физических и юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.
8. Участник аукциона, выигравший торги, либо лицо, признанное покупателем, оплачивает стоимость затрат на организацию и проведение аукционных торгов – Организатору аукционных торгов.
9. Аукцион проводится в соответствии с действующим законодательством и Положением ООО «Центр Белинвентаризация».

**Дополнительная информация на сайте www.bti-gomel.by, по тел. 8 (029) 341 15 45**

Приорбанк RBI Group

## БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 октября 2022 г.

«Приорбанк» Открытое акционерное общество

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | На 1 октября 2022 | На 1 января 2022 |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | АКТИВЫ | | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | | 471 058 | 169 985 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | | - | - |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | | 1 908 006 | 932 815 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | | 1 032 614 | 1 014 733 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | | 1 179 242 | 511 419 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | | 1 839 666 | 2 647 552 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | | 313 | 4 197 |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | | 25 781 | 25 501 |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | | 166 501 | 174 455 |
| 11 | Доходные вложения в материальные активы | 1110 | | 722 | 120 |
| 12 | Имущество, предназначенное для продажи | 1111 | | 1 334 | 1 242 |
| 13 | Отложенные налоговые активы | 1112 | | - | - |
| 14 | Прочие активы | 1113 | | 36 914 | 34 745 |
| 15 | **ИТОГО активы** | **11** | | **6 662 151** | **5 516 764** |
| 15 | ОБЯЗАТЕЛЬСТВА | | | | |
| 16 | Средства Национального банка | 1201 | | 1 009 | - |
| 17 | Средства банков | 1202 | | 495 856 | 332 008 |
| 18 | Средства клиентов | 1203 | | 4 912 417 | 4 191 792 |
| 19 | Ценные бумаги, выпущенные банком | 1204 | | 450 | 3 703 |
| 20 | Производные финансовые обязательства | 1205 | | 8 | 1 294 |
| 21 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | | - | - |
| 22 | Прочие обязательства | 1207 | | 57 713 | 57 204 |
| 23 | **ВСЕГО обязательства** | **120** | | **5 467 453** | **4 586 001** |
| 24 | СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ | | | | |
| 25 | Уставный фонд | 1211 | | 86 148 | 86 148 |
| 26 | Эмиссионный доход | 1212 | | - | - |
| 27 | Резервный фонд | 1213 | | 180 609 | 180 609 |
| 28 | Фонды переоценки статей баланса | 1214 | | 64 669 | 68 979 |
| 29 | Накопленная прибыль | 1215 | | 863 272 | 595 027 |
| 30 | ВСЕГО собственный капитал | 121 | | 1 194 698 | 930 763 |
| 31 | **ИТОГО обязательства и собственный капитал** | **12** | | **6 662 151** | **5 516 764** |

## ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ на 1 октября 2022 г.

«Приорбанк» Открытое акционерное общество

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | На 1 октября 2022 | На 1 октября 2021 |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | | 281 497 | 229 160 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | | 60 086 | 75 583 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | | 221 411 | 153 577 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | | 240 028 | 184 075 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | | 114 103 | 94 810 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | | 125 925 | 89 265 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | | - | - |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | | (30 105) | (502) |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | | 180 143 | 49 948 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | | 17 144 | 14 262 |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | | 30 919 | 10 908 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | | 16 639 | 15 538 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | | 142 172 | 135 085 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | | 8 768 | 11 545 |
| 15 | Прибыль до налогообложения | 211 | | 349 298 | 164 550 |
| 16 | Расход по налогу на прибыль | 212 | | 84 612 | 36 574 |
| 17 | **ПРИБЫЛЬ** | **2** | | **264 686** | **127 976** |

Исполняющий обязанности Председателя Правления — В.Б. Матюшкин

Главный бухгалтер — В.В. Манцивода

Финансовая отчетность размещена на интернет-странице банка: **https://www.priorbank.by/kvartal-nye-otcety**

Лицензия на осуществление банковской деятельности НБ РБ № 12 от 24.07.2019 года. УНП 100220190

Скажыце, доктар...

# ЖЫЦЬ ПАД ЦІСКАМ

## Чым небяспечная артэрыяльная гіпертэнзія і ці можна ад яе пазбавіцца?

**Паводле даных СААЗ, гіпертанія маецца ў больш чым мільярда чалавек у свеце. Але лячэнне атрымлівае толькі кожны дзясяты гіпертонік, а 2/5 нават не ведаюць аб сваім дыягназе. Аб наступствах такой бестурботнасці, а таксама пра тое, ці можна вылечыць высокі ціск і ці ёсць ад яго ўніверсальны сродак, мы даведаліся ад спецыялістаў РНПЦ «Кардыялогія».**

### Колькі беларусаў мае высокі ціск?

Артэрыяльная гіпертанія застаецца адным з самых распаўсюджаных кардыялагічных захворванняў. Як расказала **вядучы навуковы супрацоўнік лабараторыі артэрыяльнай гіпертаніі РНПЦ «Кардыялогія» Марыя ЛІВЕНЦАВА**, даследаванне STEPS, якое праводзілася ў тым ліку і ў нашай краіне двойчы, паказала, што ў 2020-м яе мелі 30,8 % беларусаў (у 2016-м — 44,9 %). Адбылося пэўнае змяншэнне.

Таксама высветлілася, што сярэдняе значэнне артэрыяльнага ціску сярод тых, хто прымае антыгіпертэнзіўнае лячэнне, таксама знізілася. Калі ў 2016 годзе яго ўзровень быў каля 135/85 мм рт. сл., то ў 2020-м — менш за 130/82 мм рт. сл.

— І самая радасная навіна, што зменшылася доля асоб з павышаным артэрыяльным ціскам, якія не прымаюць антыгіпертэнзіўныя прэпараты. У 2016-м такіх асоб было 53,5 %, а ў 2020-м — 41,5 %. Гэта тое, чаго мы дабіваемся, бо дасягненне мэтавага ціску ніжэй за 140/90 мм рт. сл. зніжае рызыку ўскладненняў, звязаных з артэрыяльнай гіпертэнзіяй.

Адначасова ёсць і сумныя навіны: захваральнасць на артэрыяльную гіпертэнзію сярод беларусаў штогод павялічваецца. Калі ў 2009 годзе яна складала 9100 чалавек на 100 тысяч насельніцтва, то ў 2021-м — ужо 13 452 чалавекі. Гэта звязана і з некаторымі выклікамі, перш за ўсё COVID-19. Сярод ускладненняў пасля перанесенага COVID-19 артэрыяльная гіпертэнзія лідзіруе. І, як прагназуюць спецыялісты, гэтай паталогіі яшчэ будзе шмат.

**Да фактараў рызыкі артэрыяльнай гіпертэнзіі адносяцца нездаровае харчаванне, недахоп фізічнай актыўнасці, злоўжыванне алкаголем і тытунём. Яшчэ адзін фактар — празмернае ўжыванне солі.**

Летась у Беларусі было зарэгістравана больш за 2 мільёны 208 тысяч пацыентаў з артэрыяльнай гіпертэнзіяй.

— Самае непрыемнае, што ў структуры ўпершыню выяўленых выпадкаў захворвання на артэрыяльную гіпертэнзію большую частку займаюць ускладненыя формы, — адзначае Марыя Лівенцава. — Гэта наяўнасць ішэмічнай хваробы сэрца ці цэрэбраваскулярныя захворванні (ішэмічны ці гемарагічны інсульт, транзіторная ішэмічная атака). Колькасць памерлых ад ішэмічнай хваробы сэрца людзей, якія мелі ў сваім анамнезе артэрыяльную гіпертэнзію, складае больш за 84 %, а памерлых ад цэрэбраваскулярных паталогій — амаль 84 %.

### Калі ціск нармалізаваўся, ці можна спыняць прыём лекаў?

Артэрыяльная гіпертэнзія патрабуе пастаяннага прыёму медыкаментаў.

— Дадзеная выснова была зроблена ў выніку вялікіх шматцэнтравых даследаванняў, якія пачаліся ў 70-я гады мінулага стагоддзя, — кажа **вядучы навуковы супрацоўнік лабараторыі артэрыяльнай гіпертаніі РНПЦ «Кардыялогія» Таццяна НЯЧЭСАВА**. —Удзельнічалі дзве групы, дзе адна прымала існуючыя прэпараты для зніжэння ціску, а іншая — плацэба, бо ў канцы 1970-х не было дакладных высноў: трэба лячыць павышаны ціск ці не? Дзякуючы даследаванням, у якіх удзельнічала больш за 20-30 тысяч пацыентаў, была атрымана адназначная выснова: лячэнне артэрыяльнай гіпертэнзіі дакладна прыводзіць да зніжэння колькасці выпадкаў парушэнняў мазгавога кровазвароту, інфаркту міякарда і смяротнасці. Былі створаны эфектыўныя прэпараты (іх пяць груп), якія мы маглі прызначаць.

Таццяна Нячэсава дадае: у той час здавалася, што эпідэмія артэрыяльнай гіпертаніі не перасягне XXI стагоддзе, але гэтыя чаканні аказаліся невыканальнымі. І прыводзіць лічбы, агучаныя на міжнародным кангрэсе кардыёлагаў, якія паказваюць, як змянілася сітуацыя па артэрыяльнай гіпертэнзіі з 1990-га да 2019-га. У аналіз былі ўключаны краіны Азіяцкага, Афрыканскага, Амерыканскага, Лацінаамерыканскага і Еўрапейскага рэгіёнаў. Высветлілася, што прымаюць прэпараты толькі 38 % мужчын і 47 % жанчын, а кантроль артэрыяльнага ціску ў 2019 годзе ажыццяўлялі ўсяго 23 % жанчын і 18 % мужчын. Тым часам СААЗ прыводзіць такі факт, што калі 70 % насельніцтва будзе кантраляваць ціск, гэта адтэрмінуе 39 мільёнаў смерцяў.

— Сёння ў нашай краіне фармацэўтычныя прэпараты прадстаўлены ў такім аб'ёме, што кожнаму пацыенту мы можам падабраць найбольш эфектыўны. Самае галоўнае — высокая прыхільнасць да лячэння. Дапускаецца адна распаўсюджаная памылка: ціск пры неўскладненай гіпертаніі можна знізіць хутка, і калі людзі дасягаюць мэтавага ўзроўню — ніжэй 140/90, а пры добрай пераноснасці і 130/80, яны лічаць, што сваё захворванне перамаглі. Але гэта не пнеўманія, калі здымак добры, хрыпаў няма, значыць, вылечыўся. Пнеўманія — вострае захворванне, а артэрыяльная гіпертэнзія — хранічнае, — падкрэслівае Таццяна Нячэсава.

Вучоныя даказалі: калі пацыент не лечыцца, рызыка сур'ёзных сардэчна-сасудзістых ускладненняў складае 48 %. Калі лячыцца нерэгулярна — 35 %. Калі вы палячыліся, а потым кінулі прыём прэпаратаў, то наносіце такую ж шкоду свайму арганізму, быццам бы не лячыліся ніколі. Таму артэрыяльная гіпертэнзія патрабуе пастаяннага прыёму прэпаратаў пад кантролем урача і самакантролем артэрыяльнага ціску.



### Ці можна назаўсёды вылечыць артэрыяльную гіпертэнзію?

— Яшчэ няма ніводнага вучонага ці доктара, які б сказаў, што восьб я вылечыў вялікую групу пацыентаў. На жаль, калі мы адмяняем гіпатэнзіўныя прэпараты, высокі ціск вяртаецца. І вельмі часта гэта з'яўляецца прычынай гіпертанічных крызаў. Гэта не азначае, што калі вам прызначылі прэпарат у пэўнай дазіроўцы, вы будзеце ўсё жыццё яго прымаць. Калі ціск змяншаецца, мы змяншаем дозу гіпатэнзіўных прэпаратаў. А яшчэ лепш, калі гэта замацавана зменай спосабу жыцця. Вы знаходзіцеся на невялікіх дозах прэпарату, але працягваеце яго прымаць, — удакладняе Таццяна Нячэсава.

### Ці можа лад жыцця зменшыць ціск?

Гэта сапраўды так. Калі прыбраць неспрыяльныя фактары, ціск можа нармалізавацца, але рабіць тое варта як мага раней. Да фактараў рызыкі артэрыяльнай гіпертэнзіі адносяцца нездаровае харчаванне, недахоп фізічнай актыўнасці, злоўжыванне алкаголем і тытунём. Яшчэ адзін фактар — празмернае ўжыванне солі. Яе змяншэнне ў апрацаваных харчовых прадуктах, а таксама зніжэнне і замена гідрагеназаваных тлушчаў на поліненасычаныя тлушчы адыгрывае вялікую ролю ў прафілактыцы.

Дарэчы, калі абмежаваць ужыванне солі, амаль 40 мільёнаў смерцяў у свеце, паводле даных СААЗ, будзе адтэрмінавана.

Таму для кожнага, хто не хоча «зарабіць» артэрыяльную гіпертэнзію, важна памятаць простыя правілы. Абмяжоўваць соль да пяці грамаў у суткі і менш, адмовіцца ад курэння, абмежаваць алкаголь, рэгулярна мець аэробныя фізічныя нагрузкі каля 150 мінут у тыдзень сярэдняй інтэнсіўнасці ці 75 мінут высокай інтэнсіўнасці. У рацыёне мусіць прысутнічаць значная колькасць свежай гародніны і фруктаў, рыбы, арэхаў, поліненасычаных тлустых кіслот у выглядзе аліўкавага алею, таксама варта знізіць ужыванне чырвонага мяса. Важна сачыць за індэксам масы цела, які не павінен перавышаць 20-25 кг на кв. м. У мужчын талія мусіць быць менш за 94 см, у жанчын — менш за 80.

### Ці неабходна з высокім ціскам пазбягаць фізічных нагрузак і стрэсу?

— Варта раздзяляць фізічныя і псіхаэмацыянальныя нагрузкі, — кажа Марыя Лівенцава. — Псіхаэмацыянальныя нагрузкі — гэта дрэнна, яны могуць выклікаць як кароткачасовае павышэнне артэрыяльнага ціску, так і фарміраванне атэ ўзбуджэння ў цэнтральнай нервовай сістэме, які будзе садзейнічаць прагрэсіраванню артэрыяльнай гіпертэнзіі, калі яна ўжо ёсць. Такіх нагрузак па магчымасці варта пазбегнуць.

**«Дапускаецца адна распаўсюджаная памылка: ціск пры неўскладненай гіпертаніі можна знізіць хутка, і калі людзі дасягаюць мэтавага ўзроўню — ніжэй 140/90, а пры добрай пераноснасці і 130/80, яны лічаць, што сваё захворванне перамаглі».**

А вось з фізічнымі нагрузкамі іншая гісторыя. Дынамічныя фізічныя нагрузкі — хадзьба, язда на веласіпедзе, плаванне — для пацыента з артэрыяльнай гіпертэнзіяй вельмі карысныя. Яны садзейнічаюць расшырэнню перыферычных сасудаў, зніжэнню іх супраціўлення, а значыць, зніжэнню артэрыяльнага ціску. Існаваў нават метад велатрэніровак, калі яна пачыналася з высокім ціскам, а праз 20 хвілін правільнай нагрузкі ціск дасягаў нармальных лічбаў.

— Што датычыцца статычных нагрузак, то для пацыента з гіпертаніяй яны некарысныя, бо адным з фактараў рызыкі развіцця ўскладнення пры гіпертаніі з'яўляецца гіпертрафія (павелічэнне) левага жалудачка. А любыя статычныя нагрузкі садзейнічаюць павелічэнню нашай сардэчнай мышцы ў аб'ёме. Вялікае сэрца добрае толькі ў паэзіі, а ў нашых пацыентаў — не, — кажа Марыя Лівенцава.

### Хто ў групе рызыкі?

Як адзначаюць спецыялісты, у Еўропе рэдка можна знайсці чалавека, у сям'і якога не было б хворых на артэрыяльную гіпертэнзію ў сувязі з яе шырокай распаўсюджанасцю. Генетычны фактар, безумоўна, адыгрывае сваю ролю, але перадаецца схільнасць да артэрыяльнай гіпертэнзіі, а не яна сама. Больш уплывае нездаровы лад жыцця. Людзі, якія ўжываюць шмат солі, мала рухаюцца, злоўжываюць алкаголем і тытунём, планамерна крочаць да артэрыяльнай гіпертэнзіі і яе ўскладненняў.

— Побач са ступенню артэрыяльнай гіпертэнзіі стаць і рызыка — там лічбы 2, 3, 4. Гэта рызыка развіцця сур'ёзных сардэчна-сасудзістых ускладненняў на працягу 10 гадоў. Вы можаце мець невысокую ступень, напрыклад першую, а рызыку — 4. У такім выпадку не варта сябе супакойваць, што ціск 146 — не вельмі высокі. Рызыка 4 сведчыць, што вам неабходна інтэнсіўна займацца сваім здароўем, у тым ліку медыкаментозным лячэннем, — тлумачыць Таццяна Нячэсава.

### Ці ёсць універсальныя лекі?

У інтэрнэце іх шмат, жартуюць спецыялісты і дадаюць, што не варта давяраць такім парадам. У арсенале медыкаў ёсць эфектыўныя сродкі. Сёння фармпрамысловасць стварае камбінаваныя сродкі: вы прымаеце адну таблетку, а ў ёй тры лекавыя сродкі, якія дзейнічаюць на розныя механізмы павышэння артэрыяльнага ціску. Але самы ўніверсальны сродак — не захварэць, а для гэтага варта думаць пра здароўе з маладосці.

— Усе мамы і таты мусяць ведаць: ваша задача сачыць за тым, што калі ў дзіцяці і пачне павышацца артэрыяльны ціск, то каб гэта адбылося як мага пазней. Па-першае, назірайце за тым, чым вы яго корміце. Соль не толькі ў сальніцы, гэта гатовыя прадукты, чыпсы, арэшкі. Калі дзіця з маленства прывыкае да салёнага, у яго павышаецца парог солевай адчувальнасці, і вы фарміруеце няправільныя смакавыя перавагі. Па-другое, мы назіраем, што нашы падлеткі рана маюць павышаныя лічбы артэрыяльнага ціску, звязаныя з ужываннем напояў з вялікім утрыманнем фруктозы. Павышаецца ўзровень мачавой кіслаты, узнікае гіперурыкемія, якая ў падлеткаў прыводзіць да павышэння артэрыяльнага ціску. Трэці момант — атлусценне. Такія дзеці маюць павышаны ўзровень халестэрыну. Наступны фактар — атмасфера ў сям'і і калектыве. Стрэс нікуды не падзенецца, але нельга ствараць напружаную сітуацыю вакол сябе, у сям'і, варта прывучаць кантактавацца добразычліва, не выклікаць узрыўных сітуацый, не спаганяць свой дрэнны настрой на акружэнне. Звярніце ўвагу, у колькі дзеці засынаюць. Мелатанін выпрацоўваецца да 12 гадзін ночы. Нізкі яго ўзровень — гэта не толькі павышэнне ўзроўню артэрыяльнага ціску, гэта і рызыка анкалагічных хвароб, і іншых захворванняў. Сядзенне за камп'ютарам да ночы — крок да артэрыяльнай гіпертэнзіі і не толькі, — рэзюмуе Таццяна Нячэсава.

**Аляксандр МАСЯЙКОЎ:**

# «Веславанне ў Беларусі было, ёсць і будзе»



**Самыя прыгожыя гісторыі пачынаюцца з кахання. У Аляксандра Масяйкова з веславаннем здарылася самае сапраўднае каханне. Як у кнігах: па волі выпадку, насуперак усяму, з перааодоленнем розных перашкод і складанасцяў, і ўсё-такі з хэпі-эндам. Аляксандр доўга шукаў свой від спорту, пакуль не спыніўся на веславанні. Супраць яго былі навуковыя тэорыі, якім давяралі многія трэнеры. Навука сцвярджала, што рост весляра павінен быць не меншы за 181 см. Аляксандру не хапала трох сантыметраў. Супраць перспектыўнага весляра была ўся навуковая сістэма. Але сваімі вынікамі ён даказаў яе недасканаласць. У 1989 і 1991 гадах ён выйграў чэмпіянат СССР. А ў 1989-м заваяваў два залатыя медалі на чэмпіянаце свету сярод юніёраў. Кульмінацыяй кар'еры стала сумесная з Дзмітрыем Даўгалёнкам перамога на Алімпійскіх гульнях у Барселоне 1992 года. Багаты спартыўны вопыт Аляксандра Масяйкова аказаўся надзвычай карысны для развіцця веславання ў Магілёўскай вобласці. Дзякуючы яму і яго аднадумцам на спартыўнай карце Беларусі з'явілася Магілёўская абласная ДЮСШ па вяслярных відах спорту. А 1 лютага 2014 года на базе гэтай школы быў створаны Магілёўскі абласны цэнтр алімпійскага рэзерву па вяслярных відах спорту. Узначаліў яго Аляксандр Анатольевіч Масяйкоў. Сам ён, як і належыць чэмпіёнам, на дасягнутым спыняцца не стаў. У 2019 годзе Аляксандр Масяйкоў абраны дэпутатам Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу. У Палаце прадстаўнікоў сёмага склікання Аляксандр Анатольевіч Масяйкоў — намеснік Пастаяннай камісіі па ахове здароўя, фізічнай культуры, сямейнай і маладзёжнай палітыцы. Але нават у палітыцы спорт не адпускае. Аляксандр Анатольевіч быў адказным за распрацоўку законапраекта «Аб змяненні законаў па пытаннях фізічнай культуры і спорту».**

**Успаміны пра спартыўную кар'еру і разважанні аб сённяшнім спорце Аляксандра Масяйкова — у інтэрв'ю «Звязды».**

***— Аляксандр Анатольевіч, традыцыйна веславанне ў Беларусі развіваецца ў паўднёвых рэгіёнах — Брэсцкім і Гомельскім. Вы родам з Магілёва. Якая школа веславання там была ў ваш час?***

— У Магілёве ў мой час як такой школы веславання не было. У Магілёўскай вобласці наш від развіваўся ў асноўным у Бабруйску. Аднак рэдка, але трапна мы выйгравалі ў спартсменаў з Гомельскай і Брэсцкай абласцей. Магілёўскія весляры, у прынцыпе, не губляліся на спаборніцтвах. Мой першы трэнер, Аляксандр Пучко, ураджэнец Магілёўшчыны, стаў чэмпіёнам Еўропы сярод юніёраў. Віктар Рэнейскі з Бабруйска — алімпійскі чэмпіён. Затым я стаў алімпійскім чэмпіёнам, пасля мяне — браты Багдановічы. Таму ў Магілёўскай вобласці вельмі моцныя традыцыі ў веславанні. Я ж прыйшоў у веславанне, калі ў Магілёве на пойме Дняпра пабудавалі новую вяслярную базу. Вядома, хлапчукі не маглі ёй не зацікавіцца. Мы адразу ж пабеглі туды, каб запісацца ў секцыю веславання. Мне трэнер сказаў, што такіх маленькіх, як я, у веславанне не бяруць. Праз два месяцы ў школу для набору дзяцей прыйшоў іншы трэнер па веславанні. Я зноў падахвоціўся і зноў пачуў, што мае даныя для веславання не падыходзяць. Але трэнер прапанаваў прыйсці ў секцыю майму сябру Гену Волкаву, ён падыходзіў выдатна: моцны, высокі хлопец. Гена папрасіў узяць і мяне, растлумачыўшы, што яму аднаму будзе сумна. Трэнер пагадзіўся. Так я першы раз абышоў навуку і трапіў у грэблю.

***— Вы перамагалі на чэмпіянатах СССР у каноэ-адзіночцы. Чаму перасталі ў двойку?***

— Зноў жа, гэтыя навуковыя патрабаванні да весляроў стаялі ў мяне на шляху. Лічылася, што адзіночнік павінен быць гардэмарынам. Паглядзець толькі на Дзіму Даўгалёнка, з якім мы ўвесь час сапернічалі ў адзіночцы. Але адзіночнае веславанне залежыць ад многіх акалічнасцяў. На двойку вецер уплывае менш, чым на адзіночку, тут галоўнае — разлік. А ў адзіночцы ты можаш сапернічаць з адналькавым па сіле сапернікам. Але вецер будзе дзьмуць з выгаднага для яго боку. І нічога з гэтым не зробіш. У двойцы ўсе ў роўных умовах. І нам, і трэнерам вельмі хацелася паказваць высокі вынік, таму мы зрабілі акцэнт на каноэ-двойцы, і мы з Дзімам Даўгалёнкам селі ў лодку.

***— Цяжка перастроіцца з адзіночкі на двойку?***

— У нас з Дзімам розныя характары: я халерык, ён больш спакойны. Гэта часам дадавала цяжкасцяў. Галоўнае — у нас было аднолькавае стаўленне да спорту, імкненне працаваць. З тэхнічнага пункту гледжання, перабудоўвацца з адзіночкі на двойку абсалютна не складана. Садзішся ў лодку і разумееш: адказвае яна табе ці не — разумееш, ці ёсць паразуменне з напарнікам. Мы з Дзімам селі ў лодку і зразумелі, што ўсё ў нас атрымаецца. Працэс пайшоў. Колькі вожыка ні трэніруй — зашкі ўсё роўна хутчэйшы. Калі з першага разу лодка не адказвае і працэс не пайшоў, то ўжо і не пойдзе. Мы з Дзімам задавалі такі тэмп, які, напэўна, і зараз не ўсе здужаюць. Мы развівалі па 106 грабкоў за хвіліну на дыстанцыі ў тысячу метраў.

***— Аляксандр Анатольевіч, праз 30 гадоў пасля Алімпійскіх гульняў што лепей за ўсё ўспамінаецца?***

— На Алімпіяду мы трапілі дзякуючы таму, што перамаглі алімпійскіх чэмпіёнаў Віктара Рэнейскага і Мікалая Жураўскага. Тры гады пасля Сеула яны нікому не прайгравалі, а тут мы. І на нас усе глядзелі са здзіўленнем, маўляў, хто гэта такія, раз яны здолелі перамагчы Рэнейскага і Жураўскага. Канешне, такая эйфарыя рабіла сваю справу. На першы заезд мы выйшлі крыху расслабленымі, нам здавалася, што мы наймацнейшыя і што медаль у кішэні. Але сапернікі паказалі, як трэба змагацца і ў фінал мы не прайшлі. Вядома, знерваваліся. А яшчэ злыя языкі масла ў агонь дабаўлялі: маўляў, узялі моладзь, а чэмпіёны дома засталіся. Дзіму гэта злавала, хоць эмоцый ён не паказваў. І мяне гэта падагравала. Заставаўся апошні шанц выйсці ў фінал — суцяшальны заезд. У мяне ў галаве была адна думка: «Якая ганьба — прыехаць на Алімпіяду і нават не прайсці ў фінал». Я нават аб медалі не думаў, мне хацелася хоць бы прайсці ў фінал. Карацей, у суцяшальным заездзе мы паказалі час лепшы, чым у фінале.

Мы з такой цяжкасцю выйшлі ў фінал. Здавалася б, трэба радавацца і настройвацца на вырашальны заезд, але дакладна не лаяцца. А мы з Дзімам пасварыліся. Прыйшлі ў нумар. Я чалавек узрыўны, заявіў, што Дзіма мне надакучыў, сабраў сумку, выцягнуў матрац на балкон і ноч перад фіналам спаў там. Раніцай на сняданку ён за адным сталом, я — за іншым. І вось так дружны дуэт выйшаў на фінал. А тут яшчэ трэнер «добрую» навіну паведамляе: прапануе іншую тактыку праходжання дыстанцыі. Мы ўвесь час адпускалі саперніка, а потым даганялі яго на фінішы. А Сяргей Альбертавіч Пастрэхін нам гаворыць адразу са старту сыходзіць у адрыў і стварыць вялікі запас. Дзіму гэтая ідэя не вельмі спадабалася. Я спрабаваў запярэчыць, што нам можа не хапіць моцы на фініш. Трэнер на гэта адказаў, што мы здольныя на многае. І я супакоіўся, да таго ж мне было за шчасце, што мы выйшлі ў фінал. І, што немалаважна, Сяргей Альбертавіч быў для нас велізарным аўтарытэтам: мы гатовыя былі выканаць любое яго заданне, бо давяралі яму як нікому іншаму, і ён для нас рабіў усё магчымае і немагчымае. Вось так павінен працаваць трэнер са спартсменамі! Змена тактыкі за 15 хвілін да старту — правільны тактычны ход. Сапернікі чакалі, што мы пойдзем як звычайна. Пастрэхін разумеў, што з новай тактыкай мы ашаломім сапернікаў ужо на старце, а на фінішы ўключацца нашы валявыя якасці і мы будзем змагацца да апошняга. Так і атрымалася: калі паглядзець відэа таго заезду, то будзе відаць, што на палове дыстанцыі мы выйгравалі корпус з невялікім. І па ходзе дыстанцыі мы выйгравалі 3-4 секунды, на самым фінішы немцы спрабавалі нас дагнаць. Але не паспелі. Мы перамаглі з адрывам 0,14 секунды.

***— Пасля Алімпіяды, акрамя перамогі на чэмпіянаце свету 1994 года, у вашага дуэта больш не было значных перамог. Праз час разумееце, чаму так атрымалася?***

— Падняцца на верх складана, але яшчэ складаней там утрымацца, да таго ж дадаюцца жыццёвыя абставіны. У 1992 годзе я адказваў сам за сябе, у мяне не было сям'і, поўнасцю аддаваўся спорту. Пазней з'явілася сям'я, трэба было надаваць час і сілы ёй. І па вялікім рахунку пасля Алімпіяды я ўжо не трэніраваўся так старанна, як да яе. Мусіць, таму і не атрымалася паўтарыць сваю алімпійскую перамогу. Былі потым перамогі на чэмпіянатах свету, медалі чэмпіянату Еўропы, але алімпійскага медаля ў маёй калекцыі больш і не з'явілася. Думаю, адбілася тое, што будучы ў зборнай Савецкага Саюза круглы год мы трэніраваліся на базах у паўднёвых рэспубліках. А ў Беларусі ў мінус пятнаццаць зімой якія могуць быць трэніроўкі на вадзе? Паўплывала і тое, што пасля развалу Савецкага Саюза наш трэнер з'ехаў на радзіму ва Украіну. Але я заўсёды шукаю прычыны сваіх няўдач у сабе. Так, трэнер з'ехаў. Але ж мы ўжо былі вопытнымі спартсменамі, ведалі, як трэніравацца. Паклаўшы руку на сэрца, варта прызнацца, што мы ўжо так не трэніраваліся, не надавалі столькі часу і сіл спорту, як да Алімпіяды. Я памятаю сябе да Барселоны, працаваў на максімуме, быў гатовы трэніравацца і днём, і ноччу. А будучы ўжо чэмпіёнам, патрабаванні да сябе знізіў.

***— Аляксандр Анатольевіч, пры вашым непасрэдным удзеле ў Магілёве з'явілася абласная дзіцяча-юнацкая спартыўная школа па вяслярных відах спорту. Раскажыце, калі ласка, пра гісторыю яе стварэння?***

— Пакінуўшы спорт, я разумеў, што трэба зарабляць на жыццё. Мяне запрасілі на працу ў Магілёўскі абласны савет БФСТ «Дынама». Я прапрацаваў там два гады, усё было добра, але цягнула ў веславанне, хацелася трэніраваць. У Магілёве не было школы па веславанні, а толькі спецыялізаванае аддзяленне ў дзіцяча-юнацкай спартыўнай школе. Зразумела, мяне там ніхто не чакаў, а грошы на жыццё былі патрэбны. Я рамантаваў машыны, прадаваў колы на кірмашы. І вось у адзін дзень, стаю я на базары, да мяне падыходзіць мужчына і пытаецца, ці не Масяйкоў маё прозвішча. Прапануе пайсці працаваць трэнерам па веславанні. Цікавіцца, на якіх умовах я пайшоў бы трэніраваць. Пытаю, хто размаўляю — не адказвае. І далей пра мяне распытвае. Я яму патлумачыў, што вельмі хачу, каб у Магілёве з'явілася школа веславання, каб былі фінансаванне, падтрымка. І ён прапануе мне стварыць дзіцяча-юнацкую спартыўную школу. У той дзень да мяне на базары падышоў начальнік упраўлення спорту Магілёўскага аблвыканкама Аляксей Алянцьевіч Мінкін. Такую магчымасць я ўпусціць не мог, мы актыўна ўзяліся за справу. Праз некалькі гадоў была створана Магілёўская абласная дзіцяча-юнацкая спартыўная школа па вяслярных відах спорту, якую я ўзначаліў. З часам школа вырасла ў абласны цэнтр алімпійскага рэзерву па вяслярных відах спорту.

***— Калі вас так цягнула веславанне, чаму вы вырашылі балатавацца ў Палату прадстаўнікоў?***

— Я з'яўляюся ганаровым грамадзянінам Магілёва. Суседзі, знаёмыя часта ў мяне цікавіліся, як ім можна вырашыць тую ці іншую праблему, прасілі дапамагчы. Я ўсім дапамагаў. Таму вырашыў пайсці на выбары ў абласны савет дэпутатаў. Зразумеў, што такім чынам я змагу і любімае веславанне развіваць, і людзям дапамагаць. А затым вырашыў балатавацца ў дэпутаты Палаты прадстаўнікоў. Алімпійскі інтарэс прачнуўся, вырашыў праверыць свае сілы. Вырашыў, што калі на Алімпіядзе ў мяне атрымалася, дык і ў парламенце ўсё атрымаецца. І атрымалася. А што да спорту, дык жаданне яго развіваць у мяне ніколі не прападала.

***— На вашу думку, адхіленне беларусаў ад міжнародных стартаў моцна паўплывае на беларускае веславанне?***

— Веславанне ў Беларусі было, ёсць і будзе. У краіне больш за 40 дзіцяча-юнацкіх спартыўных школ. Патэнцыял вельмі моцны. Працуюць добрыя трэнеры, алімпійскія чэмпіёны застаюцца і перадаюць свой досвед моладзі. Чаго граху ўтойваць: сусветны спорт сёння — гэта вялікая палітыка. Кожная краіна хоча сябе праславіць. А дзе лепш за ўсё можна паказаць свой чалавечы патэнцыял? На Алімпійскіх гульнях. Мы і ў складзе зборнай СССР, і ў складзе зборнай суверэннай Беларусі паказвалі свой патэнцыял і свае магчымасці. А многія ж не хочуць сумленна спаборнічаць. Вось і атрымліваецца, што нашыя спартсмены з-за чужых рашэнняў застаюцца за бортам. Але нават з самай складанай сітуацыі трэба рабіць высновы, каб станавіцца наймацнейшымі.



**Валерыя СЦЯЦКО.**

**Цалкам інтэрв'ю чытайце на www.zviazda.by**

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

### ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703** |
| **Продавец** | **ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, пр-т Машерова, 29** |
| **Оператор ЭТП** | **ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 4б, www.ipmtorgi.by** |

**Предмет электронных торгов**
**Лоты №№ 1–2 – машино-места**

| Лот № | Инвентарный номер | Общая площадь | Адрес | Начальная цена лота с НДС 20 %, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| **1** | 500/D-708120455 | 32,1 кв. м | **г. Минск, ул. Авакяна, 19-348** | **24 360,00** |
| **2** | 500/D-708120446 | 30,1 кв. м | **г. Минск, ул. Авакяна, 19-332** | **24 360,00** |

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок заключения договора купли-продажи: 10 рабочих** дней после проведения аукциона

**Условия оплаты предмета электронных торгов:** победитель аукциона или единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 % (далее – единственный участник аукциона), обязан произвести оплату в размере 100 % стоимости имущества не позднее **5** рабочих дней с момента заключения договора купли-продажи

**Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить установленное вознаграждение в размере 0,6 % от цены продажи в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения электронных торгов

Передача предмета аукциона победителю торгов (единственному участнику), заключившему договор купли-продажи, производится по акту приема-передачи в течение 5 (пяти) рабочих дней с момента полной оплаты стоимости имущества.
Победителю торгов (единственному участнику) обратиться за государственной регистрацией перехода права собственности на недвижимое имущество после передачи ему имущества в установленном порядке.
Расходы, связанные с организацией и проведением торгов, заключением договора купли-продажи, в том числе оплатой государственной пошлины, государственной регистрацией договора и перехода права собственности на недвижимое имущество, с удостоверением сделки, включая оплату государственной пошлины; с государственной регистрацией автомобиля несет победитель аукциона (единственный участник аукциона), заключивший договор купли-продажи.

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: в 11.00 29.11.2022 до 12.00 29.11.2022.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

